МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ, 10 ИН. ТУТ
СОЦ. ЭКОН. И ПРАВА

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 143 (5817) | 23 чэрвеня 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

НІ НА АДНУ МІНУТУ НЕ АСЛАБЛЯЦЬ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ!

Сёння мы публікуем рэзалюцыю XVI з'езда КП(б)Б. З'езд падвёў вынікі велізарнай работы, праробленай КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і валікага Сталіна за справаздачны перыяд.

У цеснай дружбе і пры дапамозе народаў СССР беларускі народ, пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б), дабіўся буйных поспехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва, у павышэнні матэрыяльна-культурнага ўзроўню жыцця працоўных. «На гэтай аснове вырасла палітычная актыўнасць працоўных БССР. Вырасла нацыянальная па форме, сацыялістычная па зместу культура, мастацтва і літаратура народаў БССР».

З усёй большэвіцкай праматой і паслядоўнасцю з'езд ускрыў буйнейшыя прарывы і недахопы ў пастаноўцы партыйна-палітычнай работы ў КП(б)Б. «У партыйных арганізацыях КП(б)Б і ў ЦК КП(б)Б—гаворыцца ў рэзалюцыі з'езда—мелі месца палітычная слепата і ілюзёрская хвароба — бясклопатнасць. У КП(б)Б яшчэ не зроблены ўсе вывады, выцякаючыя з неаднаразовых указанняў ЦК ВКП(б) і тазарыша Сталіна аб няўхільным павышэнні рэволюцыйнай пільнасці. Аб гэтым сведчыць той факт, што ўжо пасля праверкі і абмену партыйных дакументаў у партыйных арганізацыях Беларусі ўскрыта многа ворагаў, якія шкодзілі ў радзе ўчасткаў сацыялістычнага будаўніцтва і нават праніклі ў ЦК КП(б)Б».

Партыйныя арганізацыі Беларусі, захапіўшыся гаспадарчымі дасягненнямі, запусцілі партыйна-палітычную работу, забылі аб капіталістычным акружэнні, не зразумелі ўсёй розніцы «паміж старымі і новымі шкодніками, паміж шахпінцамі і троцкістамі і, не заўважыўшы гэтага, не здолелі своечасова перабудаваць для таго, каб павесці барацьбу з новымі шкоднікамі па-новаму». **(Сталін).**

«Нясвоечасоваму выкрыццю фашысцкіх шпіёнаў і шкоднікаў, займаўшых нават кіруючыя пасты, спрыяла адсутнасць да апошняга моманту разгорнутай большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ў КП(б)Б і ЖК КП(б)Б, а таксама наяўнасць элементаў сямейнасці і групоўшчыны ў кіраўніцтве КП(б)Б».

Замест таго, каб узмацніць пільнасць, разгортваць большэвіцкую крытыку і самакрытыку, у арганізацыях КП(б)Б квітнела самахвальства і падхалімства. Партыйныя сходы, пленумы райкомаў, гаркомаў і ЦК КП(б)Б, сходы партыйнага актыва вельмі часта ператвараліся ў арэну выхвальных дэманстрацый і парадаў, замест таго, каб сапраўды на гэтых сходах, пленумах з усёй большэвіцкай рэзкасцю, не гледзячы на асобы, ускрываць буйнейшыя недахопы ў рабоце.

Глыбока на з'ездзе былі ўскрыты і раскрытыкаваны буйнейшыя палітычныя памылкі і скажэнне палітыкі нашай партыі з боку Соўнаркома і ЦВК, апараты якіх былі засмечаны чужымі і варожымі люязьмі. Соўнарком і ЦВК БССР па сутнасці тармазілі перабудову работы совецкага апарата, яны прапізейнічалі мерапрыемствам партыі. Усё гэта стварала спрыяючую абстаноўку для беспакаранай шкодніцка-шпіёнскай работы мацёрых ворагаў народу — агентаў фашысцкіх захранак—Убарэвіча, Бенека, Дзякава і інш. ворагаў, якія на працяглу пару год правялі работу, накіраваную на падрыў магутнасці БССР, як фарпоста Совецкага Саюза на заходнім рубяжы з капіталістычным светам.

КП(б)Б, узброіўшыся рашэннямі Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), мудрымі ўказаннямі таварыша Сталіна, за апошнія месяцы прарабіла вялікую работу ў сэнсе выкрыцця ворагаў. Павысілася пільнасць у партыйных арганізацыях. На аснове разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ўскрыты буйнейшыя недахопы ў партыйна-палітычнай рабоце, выяўлены шматлікія факты, якія сведчаць аб тым, што прынцыпы дэмакратычнага цэнтралізма і статут партыі ў КП(б)Б парушаліся. Гэтыя месяцы пасля Пленума ЦК ВКП(б) з'явіліся вялікай школай палітычнага выхавання партыйных арганізацый. Але адсюль ні ў якім выпадку не трэба рабіць вывад, што ўжо ўсё зроблена. Наадварот, выкрыццё ворагаў толькі пачалося. Ворагі народу пакуль яшчэ не выкарчаваны да канца, палітычна-масавая работа не ўзнята яшчэ да таго ўзроўню, на які трэба яе ўзняць. Вось чаму самасупакоенасць, якая, на жаль, сям-там ужо наступае, абсалютна недапушчальна і можа прынесці нам велізарную шкоду.

Партыйныя арганізацыі ў сваёй далейшай рабоце павінны няўхільна ажыццяўляць рашэнні Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанні таварыша Сталіна, якія дадзены ў яго дакладзе і заключным слове на Пленуме, змагаючыся з усякай самасупакоенасцю і бясклопатнасцю ў рабоце. Партыйныя арганізацыі павінны карэнным чынам палепшыць пастаноўку прапаганды марксізма-ленінізма і палітычнай агітацыі, выхоўваючы партыйных і непартыйных большэвікоў у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма, беззаветнай адданасці справе Леніна—Сталіна, у духу ўсямернага ўзмацнення большэвіцкай пільнасці і непрымірымасці да ворагаў народу. Такое патрабаванне з'езда, і яно павінна быць выканана ва што-б там ні стала.

Ні на адну мінуту не аслабляць рэволюцыйнай пільнасці, узбройваць комуністаў для барацьбы з ворагамі, бязлітасна выкарчоўваць ворагаў з усіх нор, выкрываць ворагаў, якой-бы маскай яны ні прыкрываліся, усямерна павышаць партыйна-масавую работу — такое галоўнае патрабаванне і асноўны сэнс пастановы XVI з'езда КП(б)Б.

Павышэнне рэволюцыйнай пільнасці ў арганізацыі немагчыма без рашучага ўзьйму партыйна-палітычнай работы ў КП(б)Б і сярод шырокіх працоўных мас.

Выбары профсаюзных і комсамольскіх органаў з'яўляюцца першай праверкай таго, як павярнуліся партыйныя арганізацыі, наколькі сур'ёзна яны ўзяліся за выкананне рашэнняў Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

Патрабаванне «дапоўніць стары лозунг аб авалоданні тэхнікай, які адпавядае перыяду шахпінскіх часоў, новым лозунгам аб палітычным выхаванні кадраў, аб авалоданні большэвізмам і ліквідацыі нашай палітычнай даверлівасці...» абавязвае партыйныя арганізацыі, перш за ўсё, поўнасцю ліквідаваць усе буйнейшыя прарывы і недахопы ў пастаноўцы прапаганды марксізма-ленінізма. На гэту важнейшую спразу партыяй павінны быць сканцэнтраваны ўсе лепшыя партыйныя сілы. Сакратары гаркомаў, райкомаў і парткомаў павінны непасрэдна самі кіраваць агітацыйна-прапагандысцкай работай.

Нельга думаць сур'ёзна аб павышэнні пільнасці ў партыйнай арганізацыі без сур'ёзнага ўздыму справы ідэйнага ўзбраення комуністаў. Нельга думаць сур'ёзна аб павышэнні большэвіцкай пільнасці без разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ў арганізацыі, нельга думаць сур'ёзна аб павышэнні большэвіцкай пільнасці без арганізацыі сістэматычнай палітычнай работы сярод шырокіх працоўных мас.

Рашэнні партз'езда з'яўляюцца для кожнай партарганізацыі, для кожнага большэвіка канкрэтнай праграмай барацьбы за паслядоўнае ажыццяўленне гістарычных указанняў ЦК ВКП(б) і валікага **Сталіна.** Глыбока вывучыць рашэнні партыйнага з'езда і на аснове іх поўнасцю ажыццявіць выцякаючыя адсюль задачы — сэйчаны абавязак члена КП(б)Б і кожнай партарганізацыі паасобку.

КП(б)Б прапуе непасрэдна на граніцы з капіталістычным светам. Гэта накладае на яе вялікую адказнасць. БССР з'яўляецца фарпостам Совецкага Саюза на граніцы з капіталістычным Захадам. Яшчэ больш умацоўваць гэты фарпост — ганаровы абавязак комуністаў. Партарганізацыя Беларусі абавязана так узняць партыйна-палітычную работу, каб малейшыя падкопы ворага не прапускаць без разгання каб умець выкрываць ворага, якой-бы маскай ён ні прыкрываўся.

«Большэвікі Беларусі, цесна згуртаваўшыся вакол ЦК ВКП(б) і валікага правадыра партыі і працоўных таварыша Сталіна, узброеныя рашэннямі Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), ліквідуюць недахопы ў сваёй рабоце, выкарчуюць і знішчаць да канца трацкісцкіх, правых, нацыянал-фашысцкіх бандытаў — германа-японскіх і польскіх шпіёнаў і дыверсантаў і забяспечаць ператварэнне арганізацыі Беларусі ў непрыступную крэпасць абароны нашага вялікага Совецкага Саюза».

АДОЗВА ЦК КОМПАРТЫІ ІСПАНІІ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі), 21 чэрвеня. (БЕЛТА). Цэнтральны камітэт комуністычнай партыі Іспаніі выпусціў адозву па повану эвакуацыі Більбао, у якой указвае на бязмежную храбрасць і самаахвярнасць народа баскаў.

«Не было ні трусасці, ні беспарадчага адступлення, — гаворыцца ў адозве. — Матэрыяльная перавага працяўніка, якому германскі і італьянскі фашызм, здзекуючыся над «кантролем», даставіў вялікай Трусасць некаторых дэмакратычных краін, не дазволіўшых рэспубліканскай авіяцыі пралятаць над іх тэрыторыяй, прывяла да таго, што германскія і італьянскія інтэрвенты завалодваюць зямлёй і прамыслоасцю баскаў. Баскі ўрад не арганізаваў дастатковай абароны. Ён не арганізаваў рэгулярнай арміі. З другога боку, былы ваенны міністр, не гледзячы на настаянні компартыі, не зварачаў увагі на абарону Краіны баскаў.

Народ баскаў не мог перамагчы столькі перашкод. Але гэты народ не дазволіў фашызму і замежным захватчыкам узяць Більбао без бою. Рэспубліканскія сілы будуць рэарганізаваны. Яны зноў уступяць у бой для контратакі.

Народ баскаў даў узор адзінства і гераізма. Такі народ не можа быць зломан.

Перамога будзе за рэспубліканцамі, таму што яны маюць цяпер магутную армію, якая заканчвае апошнюю падрыхтоўку перад рашучымі баямі з іспанскім фашызмам і іншаземнымі захватчыкамі. Рэспубліканскі тыл будзе ачышчан. Урад прыме ўсе патрэбныя меры для аздараўлення фронтаў і тылу. Салдаты народнай арміі поўны гераізмам. «Ворагу не лёгка будзе залячыць свае страты».

РЭЗАЛЮЦЫЯ XVI З'ЕЗДА КП(б)Б ПА СПРАВАЗДАЧЫ ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы і абмеркаваўшы справаздачны даклад тав. Шаранговіча аб рабоце ЦК КП(б)Б, XVI з'езд КП(б) Беларусі прызнае палітычную лінію ЦК КП(б)Б правільнай і работу здавальняючай.

Адначасова з'езд адзначае, што ў рабоце ЦК КП(б) Беларусі меў месца рад палітычных памылак і недахопаў, асабліва ў пастаноўцы партыйна-палітычнай работы.

XVI з'езд КП(б)Б адзначае, што за справаздачны перыяд, пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б), у цеснай дружбе і пры дапамозе народаў СССР, беларускі народ дабіўся буйных поспехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва, у далейшым развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, у разгортванні стаханаўскага руху і павышэнні матэрыяльна-культурнага ўзроўню жыцця працоўных.

На гэтай аснове вырасла палітычная актыўнасць працоўных БССР. Вырасла нацыянальная па форме, сацыялістычная па зместу культура, мастацтва і літаратура народаў БССР.

Дасягнутыя поспехі з'яўляюцца рэзультатам няўхільнага ажыццяўлення генеральнай лініі партыі, ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі і знайшлі сваё яркае выражэнне ў новай Канстытуцыі БССР.

З'езд, адзнак, лічыць, што дасягненні ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва Беларусі былі-б значна большымі, калі-б кіруючыя партыйныя органы і ў першую чаргу ЦК КП(б)Б не дапусцілі буйнейшых прарываў і памылак, ліквідацыя якіх з'яўляецца першачарговай і неадкладнай задачай усёй КП(б)Б.

XVI з'езд КП(б)Б адзначае, што недахопы ў партыйна-палітычнай рабоце, ускрытыя таварышам Сталіным на Лютаўскім Пленуме ЦК ВКП(б), далкім і поўнасцю адносяцца да КП(б)Б.

У партыйных арганізацыях КП(б)Б і ў ЦК КП(б)Б мелі месца палітычная слепата і ілюзёрская хвароба — бясклопатнасць. У КП(б)Б яшчэ не зроблены ўсе вывады, выцякаючыя з неаднаразовых указанняў ЦК ВКП(б) і таварыша Сталіна аб няўхільным павышэнні рэволюцыйнай пільнасці. Аб гэтым сведчыць той факт, што ўжо пасля праверкі і абмену партыйных дакументаў у партыйных арганізацыях Беларусі ўскрыта многа ворагаў, якія шкодзілі на радзе важнейшых участкаў сацыялістычнага будаўніцтва і нават праніклі ў ЦК КП(б)Б.

З'езд падкрэслівае, што нясвоечасоваму выкрыццю фашысцкіх шпіёнаў і шкоднікаў, займаўшых нават кіруючыя пасты, спрыяла адсутнасць да апошняга часу разгорнутай большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ў КП(б)Б і ў ЦК КП(б)Б, а таксама наяўнасць элементаў сямейственасці і групоўшчыны ў кіраўніцтве КП(б)Б.

Прынцыпы дэмакратычнага цэнтралізма і статут партыі ў КП(б)Б грубейшым чынам парушаліся. Самасупакоенасць, забыццё факта капіталістычнага акружэння і пагранічнасці БССР, самавыхваленне і падхалімства, ператварэнне пленумаў мясцовых партыйных камітэтаў, пленумаў ЦК КП(б)Б і пасяджэнняў актываў у арэну пустых паладаў, выхвальных маніфестацый аб поспехах — засмечвала галовы, усыпляла людзей, замазвала недахопы ў рабоце і забівала ўсякае пачуццё пільнасці.

Усё гэта з'явілася галоўнай прычынай той палітычнай слепаты, якая была праяўлена ЦК КП(б)Б і партыйнымі камітэтамі на мясцах. ЦК КП(б)Б да апошняга часу яшчэ не перабудаваў сваёй практычнай работы ў адпаведнасці з рашэннямі Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна.

У КП(б)Б зусім недастаткова пастаўлена палітычная і дзелавая падрыхтоўка партыйных кадраў, падбор і выхаванне якіх яшчэ не сталі асноўнай работай партыйных кіраўнікоў і партыйных арганізацый.

XVI з'езд лічыць пастаноўку партыйнай прапаганды і палітычнай агітацыі ў КП(б)Б і кіраўніцтва гэтай важнейшай справай з боку ЦК КП(б)Б вельмі незадавальняючым. Справа марксісцка-ленінскай прапаганды перадаяраецца другарадным, а ў радзе выпадкаў сумніцельным у партыйных адносінах людзям, што, у прыватнасці, напярэдзяецца выкрыццём значнай колькасці ворагаў сярод прапагандыстаў. У рабоце партыйных школ і гурткоў яшчэ далёка не зжыт адрыў прапаганды ад злабадзённых пытанняў міжнароднай і ўнутранай палітыкі. Гісторыя большэвіцкай партыі ў КП(б)Б выкладаецца і вывучаецца схаластычна, без сувязі з гісторыяй усёй краіны.

Да гэтага часу зусім незадавальняюча пастаўлена вывучэнне гісторыі КП(б)Б і рэволюцыйнага руху ў Беларусі.

Палітычная агітацыя ў масах па сваёму зместу і ахопу далёка не адпавядае патрабаванням сёнешняга дня і не адказвае задачам, якія выцякаюць з палітычнага павароту ў жыцці краіны, у сувязі з прыняццем новай Сталінскай Канстытуцыі. Агітацыя носіць павярхоўны характар, адарвана ад злабадзённых пытанняў міжнароднага і ўнутранага становішча краіны. Зусім незадавальняюча пастаўлена антырэлігійная прапаганда.

XVI з'езд КП(б)Б адзначае, што апарат Соўнаркома і ЦВК быў засмечан чужымі, варожымі і неправеранымі люязьмі. У рабоце Соўнаркома і ЦВК мелі месца буйнейшыя прарывы і палітычныя скажэнні палітыкі партыі. СНК і ЦВК БССР тармазілі перабудову работы совецкага апарата і правільнае вырашэнне пытанняў гаспадарчага і совецкага будаўніцтва.

Перагібы ў адносінах да калгаснікаў і аднаасобнікаў, ускрытыя ў Лепельскім раёне і ў радзе іншых раёнаў і акруг Беларусі, паказваюць, што кіраўніцтва КП(б)Б праявіла палітычную слепату ў адносінах кіруемых ім органаў і незадавальнала задачу ўмацавання пагранічнай паласы.

У сельскай гаспадарцы, і асабліва ў жывёлагадоўлі, а таксама ў прамысловасці, на транспарце і ў галіне народнай асветы было шырока разгорнута шкодніцтва.

ЦК КП(б)Б і партарганізацыі не сумелі своечасова раскрыць і папярэдзіць шкодніцкую дзейнасць у Наркамземе, Наркомасветы і ў радзе іншых галін гаспадаркі і культуры Беларусі.

З'езд КП(б)Б адзначае, што ў рабоце совецкіх, гаспадарчых органаў і наркаматаў маюць месца зусім недапушчальная маруднасць і дабрадушнасць у справе ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Не гледзячы на поспехі, дасягнутыя ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва за справаздачны перыяд, з'езд адзначае меўшую месца недаацэнку з боку ЦК КП(б)Б велізарнага значэння нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Беларусі, у выніку чаго на гэтым участку ёсць сур'ёзныя прарывы. Трацкісцкія, нацыянал-фашысцкія і бухарынскія агенты фашызма, прабраўшыся ў кіруючыя апараты культурнага фронта, свядома праводзілі лінію на зрыў і затрымку развіцця нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу культуры (Наркомасветы, Белдзяржвыдавецтва, Саюз пісьменнікаў, Акадэмія навук, педагагічны інстытут, універсітэт, тэатр і т. д.).

XVI з'езд КП(б)Б запаўняе ЦК ВКП(б) і правадыра партыі таварыша Сталіна, што большэвікі Беларусі бязлітасна разгромяць трацкісцкіх, зіноўеўскіх, бухарынскіх, нацыянал-фашысцкіх шпіёнаў, шкоднікаў, тэрарыстаў — агентаў германа-японскага і польскага фашызма.

Злейшых ворагаў народу, прадаўшых радзіму, агентаў замежных разведак мы будзем знішчаць як шалёных сабак. Уся КП(б)Б акажа ў гэтай справе штодзённую дапамогу органам НКВД на чале з іх баявым кіраўніком тав. Ежовым.

XVI з'езд КП(б)Б абавязвае ЦК КП(б)Б і ўсе партыйныя арганізацыі ў сваёй далейшай рабоце няўхільна ажыццяўляць рашэнні Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанні таварыша Сталіна, якія дадзены ў яго дакладзе і заключным слове на Пленуме, змагаючыся з усякай самазаспакоенасцю і бясклопатнасцю ў рабоце. Партыйныя арганізацыі павінны карэнным чынам палепшыць пастаноўку прапаганды марксізма-ленінізма і палітычнай агітацыі, выхоўваць партыйных і непартыйных большэвікоў у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма, беззаветнай адданасці справе Леніна—Сталіна, у духу ўсямернага ўзмацнення большэвіцкай пільнасці і непрымірымасці да ворагаў народу.

Пільнасць павінна заключацца перш за ўсё ў ідэйным узбраенні комуністаў, у авалоданні вучэннем Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, у разгортванні крытыкі і самакрытыкі, ва ўменні выкрываць і знішчаць трацкісцкіх, бухарынскіх, германа-японскіх, польскіх і нацыянал-фашысцкіх шпіёнаў, дыверсантаў і тэрарыстаў.

З'езд прапануе ЦК КП(б)Б наладзіць сістэматычную работу па азнаямленню партыйных і непартыйных большэвікоў з мэтамі, метадамі і практыкай шкодніцкай і дыверсійнай работы замежных разведчых органаў і іх трацкісцка-бухарынскай і нацыянал-фашысцкай агентуры.

З'езд КП(б)Б абавязвае ЦК КП(б)Б перабудаваць сваю работу такім чынам, каб галоўным у рабоце ЦК КП(б)Б была дапамога акругкомам, гаркомам і райкомам у выкананні рашэнняў Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна і ў падрыхтоўцы да выбараў у вярхоўныя органы краіны.

Справа падбору і выхавання работнікаў павінна быць асноўнай работай партыйных кіраўнікоў. У падборы работнікаў неабходна няўхільна кіравацца рашэннем Пленума ЦК ВКП(б), які абавязаў «партыйныя арганізацыі аднавіць большэвіцкую практыку палітычнага і дзелавога падыходу да пытанняў размеркавання партыйных сіл, выключаючую ўсякую сямейственасць і арцельнасць, з тым, каб работнікі праваяліся сістэматычна па рэзультатах іх работы».

ЦК КП(б)Б павінен узмацніць сувязь з партыйнымі арганізацыямі, у тым ліку з пярвічнымі партарганізацыямі, забяспечыць рэгулярныя скліканні актываў, упягненне ў работу членаў пленумаў гаркомаў, райкомаў, членаў парткомаў.

З'езд даручае ЦК КП(б)Б прыняць меры да своечасовага выканання ўсімі партарганізацыямі КП(б)Б пастановы Пленума ЦК ВКП(б) аб падборы намеснікаў сакратароў акругкомаў, гаркомаў, райкомаў і парткомаў.

Усе партыйныя арганізацыі павінны выканаць на справе ўказанне таварыша Сталіна аб чулых адносінах да членаў партыі, пераглядзеўшы рашэнні аб няправільна выключаных з партыі за пасіўнасць і скончыць разгляд апеляцый. Строга прытрымлівацца пастановы ЦК ВКП(б) аб прыёме ў партыю, падыходзячы індывідуальна да кожнага прымаемага ў члены і кандыдаты партыі і ў спачуваючыя.

З'езд даручае партыйным арганізацыям у бліжайшы час знішчыць маючыяся ў КП(б)Б сур'ёзныя недахопы ў рабоце з кандыдатамі і спачуваючымі.

ЦК КП(б)Б павінен сур'ёзна паставіць справу партыйнай прапаганды, падабраць на гэты ўчастак у бліжайшы час лепшыя партыйныя сілы. Сакратары гаркомаў, райкомаў і парткомаў павінны самі займацца пытаннямі пастаноўкі партыйнай прапаганды і агітацыі, сістэматычна інструктаваць прапагандыстаў і агітатараў па пытаннях палітыкі партыі, арганізоўваць для партыйнага актыва кансультацыі і даклады па асноўных пытаннях міжнароднага і ўнутранага становішча краіны.

У далейшым разгортванні партыйнай прапаганды неабходна выходзіць з таго, каб, у адпаведнасці з указаннямі таварыша Сталіна ў яго пісьме ўкладальнікам падручніка па гісторыі ВКП(б), рашуча палепшыць вывучэнне комуністамі гісторыі і палітыкі партыі, яе барацьбы супроць небольшэвіцкіх плыняў і груповак.

Неабходна карэнным чынам палепшыць палітычную агітацыю з тым, каб яна забяспечвала своечасовае давядзенне мерапрыемстваў партыі і ўрада да сазнання кожнага працоўнага.

У агітацыйнай рабоце неабходна шырока практыкаваць правядзенне палітдзён у горадзе, на прадпрыемствах і ў калгасах з ахопам аднаасобнікаў. Не павінна быць ні аднаго прадпрыемства, установы, калгаса, населенага пункта, навучальнай установы, арцелі, кулы-б рэгулярна не прыязджалі партыйныя агітатары для растлумачэння міжнароднага і ўнутранага становішча СССР і чарговых задач партыі і совецкай улады.

З'езд падкрэслівае велізарнае значэнне антырэлігійнай прапаганды ў сучасны момант і лічыць найпершым абавязкам кожнай партыйнай арганізацыі — наладжанне шырокай сістэматычнай антырэлігійнай прапаганды ў масах, выкрываючы сутнасць контрррэволюцыйнай шпіёнскай работы паркоўнікаў і сектанцкіх груп.

XVI з'езд КП(б)Б даручае ЦК КП(б)Б у самы кароткі тэрмін распрацаваць і ажыццявіць суму мерапрыемстваў у галіне палітычнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі партыйных кадраў, актыва гаспадарчых і совецкіх работнікаў, кіруючыся рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна.

ЦК КП(б)Б, гаркомы і райкомы на мясцах павінны рашуча ўзмацніць кіраўніцтва друкам, узмацніць газеты і выдавецтвы кваліфікаванымі, праверанымі людзьмі, вышэй узняць ідэйна-палітычны ўзровень газет, забяспечыць шырокае разгортванне на іх старонках большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, узмацніць сувязь газет з масамі.

З'езд абавязвае партыйныя арганізацыі Беларусі, наркаматы, трэсты і дырэктараў прадпрыемстваў прыняць усе меры да поўнай ліквідацыі вынікаў трацкісцка-бухарынскага і нацыянал-фашысцкага шкодніцтва ў прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, у галіне будаўніцтва, чыгуначнага, воднага, шасейнага транспарта і гандлю Беларусі.

Партыйныя арганізацыі павінны забяспечыць безумоўнае выкананне ўсіх заданняў партыі і ўрада па выпуску прадукцыі прамысловасці, у асаблівасці якасных паказальнікаў, узмацніць кіраўніцтва стаханаўскім рухам, шырока разгарнуць яго, узмацніць працоўную дысцыпліну на прадпрыемствах, смялей вылучаць маладых, адданых партыі рабочых-стаханаўцаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў на камандныя пасады ў прамысловасці і на транспарце.

З'езд даручае партыйным арганізацыям забяспечыць узмацненне партыйнага кіраўніцтва гаспадарчымі арганізацыямі ў прамысловасці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы, не дапускаючы падмены гаспадарнікаў, шырока разгортваючы і падтрымліваючы іх ініцыятыву.

Забяспечыць безумоўнае выкананне рашэнняў ЦК ВКП(б) аб рэгулярным скліканні актываў наркаматаў, трэстаў, прадпрыемстваў, дарог і т. д., аднавіць і арганізаваць работу вытворчых нарад на ўсіх прадпрыемствах, разгортваючы большэвіцкую крытыку і самакрытыку ўсіх недахопаў у рабоце гаспадарнікаў, дапамагаючы ім у авалоданні большэвізмам.

З'езд лічыць цэнтральнай задачай усіх партыйных, гаспадарчых, совецкіх і прафесіянальных арганізацый Беларусі штодзённыя клопаты аб далейшым палепшанні матэрыяльна-бытавога абслугоўвання шырокіх працоўных мас БССР. Важнейшай задачай партыйных арганізацый Беларусі з'яўляецца рашучае палепшанне работы лёгкай, харчовай і мясновай прамысловасці, значнае павелічэнне выпуску тавараў шырокага спажывання, у асаблівасці з мясновай сыравіны.

З'езд даручае ЦК КП(б)Б і СНК Беларусі прыняць неадкладныя меры да ліквідацыі адставання энергетычнай гаспадаркі ад патрэб народнай гаспадаркі ў электраэнергіі, прыняўшы меры да палепшання работы БелДРЭСа і іншых электрычных станцый рэспублікі.

З'езд абавязвае ЦК КП(б)Б і СНК БССР аддаць выключна сур'ёзную ўвагу складанню плана 3-й пяцігодкі і шырока прыцягнуць да яго распрацоўкі і абмеркавання партыйны актыў, стаханаўцаў прадпрыемстваў і сельскай гаспадаркі, буйных спецыялістаў, ІТР і інш.

ЦК КП(б)Б павінен рашуча ажыць існаваўшую практыку прыняцця партыйна-палітычнай работы ў гарадах і ролі горада ў сацыялістычным будаўніцтве рэспублікі, забяспечыць на ўсёй сваёй рабоце вядучую ролю гарадоў у партыйна-палітычнай і гаспадарчай рабоце рэспублікі і вырошчванні партыйных кадраў.

Ліквідацыя вынікаў шкодніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі з'яўляецца адной з асноўных задач КП(б)Б на прадстаячы перыяд.

З'езд даручае ЦК КП(б)Б і СНК БССР прыняць усе меры да поўнай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў галіне жывёлагадоўлі, у прыватнасці, арганізаваць рашучую барацьбу за спыненне эпізаатычных захворванняў.

З'езд асабліва падкрэслівае задачу ўздыму, вырошчвання і захавання конскага паголўя Беларусі і папярэджвае ўсе партыйныя арганізацыі, што яны павінны адносіцца да гэтай справы, як да важнейшай дзяржаўнай, гаспадарчай, палітычнай і абаронай задачы.

Партыйныя арганізацыі КП(б)Б павінны весці рашучую барацьбу з усякімі парушэннямі Статута сельскагаспадарчай арцелі, забяспечыць сапраўдны пастаянны кантроль агульных сходаў калгаснікаў за работай праўленняў калгасаў.

З'езд вітае прынятыя па ініцыятыве таварыша Сталіна рашэнні ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР аб буйных ільготах і дапамозе калгасам і аднаасобнікам БССР і зварачае ўвагу ўсіх партыйных, совецкіх і гаспадарчых арганізацый на тое, што аказаная калгаснікам і аднаасобнікам велізарная матэрыяльная дапамога павінна з'яднаць магутным рычагом арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў і ўздыму жыццёвага ўзроўню працоўных мас калгаснікаў і аднаасобнікаў Беларусі.

Партарганізацыі КП(б)Б абавязаны забяспечыць, на аснове практычнага правядзення гэтых важнейшых рашэнняў партыі і ўрада ў жыццё, яшчэ больш ўзлым творчага энтузіязма калгаснікаў і аднаасобнікаў Беларусі на выкананне чарговых гаспадарчых задач (сенаўборка, уборка ўраджаю, выкананне дзяржаўных абавязацельстваў і т. д.).

Важнейшай палітычнай і гаспадарчай задачай усёй КП(б)Б з'яўляецца барацьба за ўсямернае павышэнне кошту прадукцыі ў кожным калгасе Беларусі.

ЦК КП(б)Б, акругкомы і райкомы абавязаны забяспечыць рашучае палепшанне гаспадарчай і партыйна-палітычнай работы ў МТС і соўгасах.

ЦК КП(б)Б і ўсе партыйныя арганізацыі Беларусі, у мэтах ліквідацыі адставання раду галін сельскай гаспадаркі Беларусі і поўнай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, павінны неадкладна прыняць меры да ўмацавання земельных органаў у цэнтры і на месцах моцнымі, праверанымі палітычна і прыгоднымі па дзелавой кваліфікацыі работнікамі, звярнуўшы ўвагу на вылучэнне растучых работнікаў і асабліва жанчын (старшыні калгасаў, брыгадзіры, трактарысты і т. д.).

XVI з'езд КП(б)Б даручае ЦК КП(б)Б і соўнаркому БССР у далейшай сваёй рабоце забяспечыць правільнае ўвядзенне севазвароту, карэннае палепшанне справы насеннаводства, жывёлагадоўлі, агратэхнікі, асваенне новых зямель (мелыярацыя, раскарчоўка і т. д.) з тым, каб па-большэвіцку выканаць указанні таварыша Сталіна аб вытворчасці 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

З'езд даручае партыйным арганізацыям КП(б)Б прыняць сур'ёзныя меры да палепшання партыйна-палітычнай работы сярод настаўніцтва, да поўнай ліквідацыі ўсіх вынікаў шкодніцтва ў органах Наркомасветы, у школе і на іншых участках нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Неабходна навесці большэвіцкі парадак у выдавецкіх арганізацыях і Саюзе пісьменнікаў.

ЦК КП(б)Б павінен у бліжэйшы час умацаваць органы народнай асветы і іншыя ўчасткі нацыянальна-культурнага будаўніцтва (літаратура, мастацтва, навуковыя і вышэйшыя навучальныя ўстановы і т. д.) праверанымі, большэвіцкімі кадрамі, смела вылучаючы растучых маладых работнікаў, у асаблівасці з беларусаў.

ЦК, гаркомы, акругкомы і райкомы павінны ўзяць пад свой асобы кантроль справу дапамогі і выхавання работнікаў ідэалагічнага фронта, у асаблівасці новавылучаных маладых кадраў.

З'езд асабліва падкрэслівае, што сувязь партыйных арганізацый КП(б)Б з часцямі Чырвонай Арміі ў сучасны момант як ніколі павінна быць самай цеснай. З'езд абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі аказваць усямерную дапамогу партыйным арганізацыям Чырвонай Арміі і пагранічнай аховы ў справе выканання ўскладзеных на іх задач па выхаванню чырвонаармейцаў і камандна-палітычнага састава арміі ў духу совецкага патрыятызма, непрымірымасці да ўсіх ворагаў народу, умацавання боездольнасці Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і беззаветнай адданасці комуністычнай партыі і таварышу Сталіну.

Адзначаючы дрэнную работу масавых грамадскіх абаронных арганізацый (Асоавіяхім, «Чырвоны Крыж» і т. д.), з'езд даручае ЦК КП(б)Б і ўсім партыйным арганізацыям прыняць меры да ажыўлення і палепшання работы гэтых важнейшых абаронных арганізацый, рашуча ачышчаючы кіраўніцтва іх ад чужых і варожых элементаў.

З'езд абавязвае ЦК КП(б)Б у сваёй штодзённай рабоце аказваць максімальную дапамогу ў наладжанні партыйна-палітычнай работы на транспарце і хутчэйшай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, умацаванні боездольнасці чыгуначнага, воднага і шасейнага транспарта рэспублікі, маючага вялікае абаронае значэнне.

Падрыхтоўка да выбараў у советы на аснове Сталінскай Канстытуцыі, задача ўзначаліць палітычны паварот у жыцці краіны патрабуе ад усіх партыйных арганізацый КП(б)Б выключнай увагі і клопатаў аб палепшанні работы ўсіх органаў совецкай улады ў Беларусі.

Важнейшае палітычнае рашэнне ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР аб вызваленні сельскіх советаў ад збору паставак, налогавых функцый, стварае поўную магчымасць для сур'ёзнага ўздыму і палепшанні работы сельсоветаў. З'езд абавязвае партыйныя арганізацыі забяспечыць перабудову работы сельскіх созетаў у духу патрабаванняў Сталінскай Канстытуцыі.

З'езд прапануе ЦК КП(б)Б, акругкомам, гаркомам і райкомам партыі смялей вылучаць на кіруючую совецкую работу ў раёнах і гарадах маладых, вырасшых, якія карыстаюцца аўтарытэтам, дзелавых і палітычна правераных работнікаў з старшынь сельсоветаў, профсаюзнага актыва, з лепшых стаханаўцаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

З'езд адзначае выключную запушчанас

ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА САКРАТАРА ЦК КП(б)Б тав. В. Ф. ШАРАНГОВІЧА ПА СПРАВАЗДАЧЫ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА НА XVI З'ЕЗДЗЕ КП(б)Б

Таварышы, наш з'езд і спрэчкі на нашым з'ездзе яшчэ раз прадэманстравалі і пацвердзілі выключную прынцыпіальнасць даклада і заключнага слова таварыша Сталіна, які ўскрыў у нашай рабоце і ва ўсёй пастаноўцы партыйна-палітычнай работы буйнейшыя памылкі і недахопы. Спрэчкі на нашым з'ездзе праходзілі безумоўна на высокім палітычным узроўні. Гэта паказвае, што большэвіцкая пільнасць у нашай партыйнай арганізацыі павышаецца і асабліва наглядна гэта дэманструе велізарнае згуртаванне КП(б)Б вакол ЦК ВКП(б), вакол таварыша Сталіна.

Спрэчкі на нашым з'ездзе паказваюць, што большэвікі Беларусі разумеюць складанасць і адказнасць задач, якія стаяць перад намі і гатовы ва ўсеўзбраенні выканаць гэтыя задачы і гэтым самым апраўдаць тую адказнасць і давер'е, якія ўскладаюцца на нас з боку ЦК ВКП(б), з боку таварыша Сталіна.

Недахопам нашых спрэчак з'яўляецца тое, што таварышы мала гаварылі па канкрэтных пытаннях перабудовы партыйнай работы і асабліва па канкрэтных пытаннях работы і задач, звязаных з гаспадаркай, з культурай. Зразумела, тое завастрэнне большэвіцкай пільнасці, якое выявілася на з'ездзе, з'яўляецца несумненна вялікім плюсам. Аднак, мы ніяк не можам упускаць пытанняў, звязаных з канкрэтнай перабудовай нашай работы, звязаных з гаспадарчым і культурным будаўніцтвам. Вы разумееце, таварышы, што тыя вялікія задачы, якія перад намі стаяць і ў галіне прамысловасці, і ў галіне сельскай гаспадаркі, і ў галіне культуры, і ў першую чаргу ў галіне перабудовы партыйна-палітычнай работы — не могуць быць выкананы самацёкам. Мы за іх павінны змагацца і мабілізаваць усю нашу партыйную арганізацыю, усіх членаў партыі, усіх непартыйных большэвікоў на выкананне гэтых задач.

Зразумела, таварышы, выкананне гэтых задач, якія стаяць перад намі, яшчэ ўскладняецца тым, што мы, як бачыце, раскрываем у Беларусі і раскрылі вялікую шкодніцкую работу, якую праводзілі ворагі партыі, ворагі совецкай улады. І само сабой зразумела, што ліквідацыя вынікаў шкодніцтва і ў галіне гаспадарчай, і ў галіне культуры ёсць вялікая, адказная справа. Было-б небяспечным, таварышы, недаацэньваць гэтыя вынікі шкодніцтва. Было-б вельмі небяспечным перапаменшыць значэнне той вялікай шкодніцкай работы, якую тут праводзілі ворагі, засеўшыя на адказных участках нашай совецкай і гаспадарчай работы. Калі мы хоць крыху недаацэнім гэтыя вынікі і не прымем меры да ліквідацыі шкодніцтва, мы, зразумела, не зможам выканаць усіх задач, якія стаяць перад намі, мы акажамся простымі балбатунамі, а не большэвікамі, якія павінны рабіць з усіх тых падзей, якія ў нас адбыліся і адбываюцца, неабходныя і агульнапалітычныя і канкрэтныя практычныя вывады для сваёй работы.

Мы павінны папярэдзіць усіх нашых комуністаў, кіруючыя нашы партыйныя органы і ўсю партыйную арганізацыю ад такога настрою, які сям-там можа праяўляцца, што мы, моў, пасамакрытыкаваліся, на з'ездзе крытыку разгарнулі, а зараз можам быць ужо спакойны. Па гэтых настроях і па такіх адносінах да справы мы павінны самым рашучым чынам біць і выкрываць канкрэтных носьбітаў гэтых настрояў.

Я думаю, што мы ўсе павінны зразумець, наколькі складаны і адказны задачы, якія перад намі стаяць, аб якіх . усе таварышы гаварылі і якія мы, выходзячы з рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б), даклада і заключнага слова таварыша Сталіна, запішам у сваю рэзалюцыю, якую будзем прымаць па справаздачы Цэнтральнага Камітэта партыі. Нам патрэбна зараз мабілізаванне і вельмі многа, добрасумленна, з усёй большэвіцкай гарачынёй, не шкадуючы сябе і часу, прапаваць для таго, каб у самы найкарацейшы тэрмін гэтыя вынікі ў нас у рэспубліцы ліквідаваць і даказаць ЦК нашай партыі, таварышу Сталіну, што мы, большэвікі Беларусі, не толькі ўмеем выкрываць ворагаў, але ўмеем быстра выпраўляць свае памылкі і недахопы, даказаць, што мы гэтыя памылкі і недахопы на справе выпраўляем.

Мы таксама, таварышы, не можам шарахацца і ў другі бок, як гэта могуць рабіць некаторыя людзі ў нашых радах. Мы павінны ад гэтага вельмі строга перасцерагчы. Можа стварыцца ўражанне, асабліва ў людзей малаўстойлівых, якія не разбіраюцца яшчэ да канца ва ўсёй гэтай абстаноўцы і ўсіх падзеях, якія адбываюцца ў сувязі з выкрыццём агентаў японска-германскага фашызма, трацкістаў, правых, нацыянал-фашыстаў, шпіёнаў, дыверсантаў, — у асобных нашых комуністаў і асабліва ў асобных беспартыйных рабочых, калгаснікаў і наогул працоўных, што ў нас наогул усё дрэнна, што ў нас усюды сядзяць ворагі і т. д.

Не так абстаіць справа. Мы маем велізарныя поспехі, мы маем вялікія перамогі, і тое, што мы зараз выкрываем усю гэту сволач, паказвае не слабасць нашу, а нашу сілу, паказвае нашу згуртаванасць, наш рост, паказвае, што наша партыйная арганізацыя, павышаючы большэвіцкую пільнасць, разгортваючы самакрытыку ў партыйнай арганізацыі на аснове рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б), прымяняючы ўказанні таварыша Сталіна, змагла і зможа выкрыць да канца ворагаў, якія праводзілі сваю падрыўную работу, засеўшы на адказных пастах у нашай рэспубліцы. Іменна так трэба разумець і разглядаць усе падзеі — як нашу сілу, а не як нашу слабасць. Чым хутчэй і мацней мы ачысцімся, чым хутчэй выкрыем ворагаў, якія запісаліся на той ці іншы пост, у тую ці іншую ўстанову, якія, маскіруючыся, пішком праводзяць падрыўную работу супроць нас,—тым быстрай мы забяспечым новы ўздым мас на выкананне тых задач, якія перад намі стаяць.

Няправільным будзе настрой, які можа выходзіць ад малаўстойлівых людзей, гэта настрой недавер'я да кадраў. Нельга ўсе кадры браць пад сумненне. Гэта было-б проста злачынствам, калі-б мы зараз, у сувязі з тым, што раскрываецца рад ворагаў, засеўшых на адказных участках, пачалі распаўсюджваць і патуралі-б гэтым настроям, якія могуць выходзіць ад асобных людзей. Вы павінны ўлічыць, таварышы, што вораг працуе і вядзе барацьбу з намі рознымі спосабамі і што вораг можа сеяць і усякія правакацыі, у тым ліку і сярод нас, правакацыі, якія заключаюцца і ў тым, каб стварыць недавер'е да кадраў і ў тым ліку да кіруючых кадраў.

Таварышы, наша партыя, наш рабочы клас на ўсім сваім шляху ва ўмовах совецкай рэчаіснасці прайшлі праз вельмі цяжкія этапы. У нас быў перыяд грамадзянскай вайны, у нас быў і перыяд вельмі цяжкі ў социялістычным будаўніцтве. На ўсім гэтым шляху мы беззаветна, у тым ліку і КП(б)Б, былі адданы нашай партыі, нашаму Цэнтральнаму Камітэту, нашаму таварышу Сталіну. На гэтым-жа шляху мы выкрылі нямала ворагаў, здраднікаў, прадажнікаў, шпіёнаў, дыверсантаў супроць нашай радзімы.

Зразумела, таварышы, на такім вострым этапе, які мы перажываем зараз, асабліва ў сувязі з міжнароднай абстаноўкай, было-б дзіўна, як гэта вучыць нас таварыш Сталін, каб ворагі нас пакінулі ў спакоі. І мы на прыкладзе ў сябе, тут у Беларусі, у КП(б)Б бачым, што несумненна, ворагі нас не пакідаюць у спакоі, што яны засылаюць сваіх агентаў для таго, каб пакасіць, шкодзіць, шпіёніць, ашукваць, маскіравацца, усякімі спосабамі весці падрыўную работу супроць нас.

Але, таварышы, няма такой сілы, якая-б магла пахістаць нашу магутнасць, нашу згуртаванасць, нашу маралітнасць, якая магла-б у якой-небудзь меры пыпыніць паспяховы ход нашага социялістычнага будаўніцтва. Усе гэтыя мерзотнікі, гады, зразумела, будуць выкрыты да канца.

Мы, зразумела, павінны правяраць нашых людзей, на якім-бы посту яны ні сталі, кантраляваць іх работу, правяраць з удзелам шырокага актыва, шырокіх партыйных і беспартыйных мас.

У гэтым сэнсе ўсёй нашай работы, у гэтым сутнасць зараз у адносінах праверкі кадраў, праверкі людзей, у гэтым сутнасць арганізацыі нашай работы. Калі мы забяспечым добра нашу работу, каб усе ізеяні нашых партыйных органаў і кіруючых партыйных работнікаў знаходзіліся пад штодзённым кантролем партыйных і беспартыйных мас, а мы гэта павінны зрабіць, тады, зразумела, і справа павышэння пільнасці і справа выкрыцця ворагаў, якія, магчыма, яшчэ ў тым ці іншым месцы схаваліся, зацясаліся ў нашых радах, стараюцца маскіравацца для таго, каб пачакаць і ў патрэбны момант нам шкодзіць — будзе паспяхова лепш і мы гэтых ворагаў быстрэй будзем выкрываць.

Мы не можам стварыць такога становішча, каб кожнага работніка, які ў тым ці іншым месцы працаваў з выкрытым ворагам, неадкладна браць пад падазрэнне. Мы павінны правяраць старанна ўсё гэта.

Я лічу, таварышы, што па нашым з'ездзе былі асобныя выступленні таварышоў, якія, крышачку, злёгку, не зусім абгрунтавана часамі проста гаварылі: я бяру таго або іншага чалавека пад сумненне, пад падазрэнне. Зразумела, справа кожнага члена партыі браць пад сумненне і пад падазрэнне любога таварыша, але гэта ўсё-такі з'езд партыі, гэта вышэйшы орган нашай КП(б)Б. Для таго, каб сказаць аб тым, што той або іншы таварыш бярэцца пад сумненне або пад падазрэнне, трэба прывесці факты, даныя, абгрунтаваць усё канкрэтна, сказаць, што вось тое і тое ён зрабіў. Не ў тым заключаецца пільнасць, што я выйду і скажу, што я бяру такога вось чалавека пад падазрэнне. Пільнасць заключаецца ў канкрэтным абвінавачанні, у канкрэтных фактах, у прад'яўленні канкрэтных абгрунтаваных матэрыялаў.

На нашым з'ездзе былі асобныя выступленні, у якіх прыводзіліся факты аб радзе таварышоў. Зразумела, новы Цэнтральны Камітэт нашай партыі, які вы выбярэце, павінен будзе праверыць гэтыя факты, узважыць іх, як належыць, таму што мы не можам ні аднаго факта пакінуць без разгляду. Магчыма, што ў таварыша былі асобныя памылкі, якія ён дапусціў, а можа быць, былі сур'ёзныя рэчы, па якіх, магчыма, патрэбна рабіць сур'ёзныя палітычныя вывады.

Таварышы, я хачу некалькі слоў сказаць аб нацыянальна-культурным фронце. Аб нашых задачах на гэтым участку я гаварыў у сваім дакладзе, дадаць тут не маю чаго, асабліва таму, што, мне здаецца, таварышы, якія выступалі, практычна ў сваіх прапановах дапоўнілі некаторыя моманты, з якімі я, несумненна, згодзен. Але я хацеў-бы адзін бок гэтага пытання закрануць. Гэта аб кадрах, якія працуюць у нас на нацыянальна-культурным фронце.

Таварышы, значэнне гэтага ўчастка работы для нас, для КП(б)Б, для ўсяго нашага социялістычнага будаўніцтва велізарнае. Яшчэ больш узрастае значэнне ідэалагічнага фронта для нас пасля рашэння Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

Усе вы ведаеце, аб гэтым гаварылася на з'ездзе, што ў нас на гэтым участку не ўсё добра. Тут ЦК КП(б)Б дапусціў вялікую колькасць памылак. Засмечанасць тут была вялікая ворагамі.

Але я думаю, таварышы, што мы ўсе павінны згадзіцца з той акалічнасцю, што асабліва на гэтым участку гэта пяякам выпікае з інтарэсаў партыі, правядзення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, правільнага правядзення ўказанняў і рашэнняў ЦК ВКП(б) у адносінах культурных кадраў, я ўжо не гавару аб нашых кадрах, нашых пролетарскіх, блізкіх да нас кадрах, але і да тых, якія маюць хоць-бы малейшую здольнасць і жадаюць да нас наблізіцца ў сваёй рабоце, для таго, каб прыносіць якую-небудзь карысць,—мы ім гэтых кадраў павінны падыходзіць вельмі асцярожна, дапамагаць ім, выхоўваць іх з найвялікшымі клопатамі, таму што недахват кадраў тут вялікі і кожнаму чалавеку, паказваючаму, паўтараю, хоць некаторыя адзнакі, што ён стараецца перабудоўваецца, прысці да нас бліжэй, наблізіцца, мы павінны аказаць дапамогу і ўвагу.

Мы павінны добра паглядзець і праверыць, што робіцца сярод пісьменнікаў. І зусім правы выступаўшыя тут таварышы, калі гаварылі наконт таго, каб умацаваць гэты ўчастак; дапамагчы патрэбна ім, прычым не толькі рашэннямі, а, ведаеце, наблізіць іх цеплынёй нашай, — гэта-ж у нашых руках, на нашым абавязку ляжыць; нашым партыйным уплывам, нашым партыйным блізкім баўкоўскім падыходам да іх — да таварышоў, якія стараюцца чэсна працаваць, інакш мы створым нядобры настрой, і людзі, якія не з'яўляюцца ворагамі, магчыма, якія хістаюцца, — гэтым людзям мы створым абстаноўку, што яны пойдуць да ворагаў.

Так, таварышы, і на іншых участках культурнага фронта.

Мы тут да кадраў ідэалагічнага фронта павінны вельмі і вельмі сур'ёзна і ўважліва падыходзіць, адносіцца з ўсёй сур'ёзнасцю, не кідаць людзей, калі няма дастатковых падстаў, асабліва хістаючыхся, у лапы ворага.

Вось, таварышы, заўвагі адносна нашага культурнага ўчастка.

Я гаварыў і ў дакладзе, што мы маем і на культурным фронце ўзросшыя большэвіцкія кадры, добрыя кадры і многа гэтых кадраў. Мы павінны ў ЦК, у гаркомах нашых, райкомах, акругкомах узяць пад асобны нагляд кадры, працуючыя на ідэалагічным фронце, на культурным фронце, у тым сэнсе, каб іх сістэматычна правяраць, дапамагаць ім выпраўляць іх памылкі, недахопы, забяспечыць гэтым кадрам магчымасць развівацца і расці.

Далей таварышы, я лічу, што тав. Конікаў зрабіў тут не зусім правільны вывад адносна таго, што трэба ліквідаваць водападзел паміж партыйнай і совецкай работай. Таварышы, аб якім водападзеле ідзе гутарка? Я думаю, што трэба нямнога паправіць тав. Конікава і сказаць, што ніякага ў нас водападзелу няма; у нас ёсць практычныя недахопы, якія мы павінны знішчыць, узмацніць кіраўніцтва з боку ЦК, з боку гаркомаў, райкомаў, акругкомаў совецкім апаратам. Гэтага патрабуюць ад нас Пленум ЦК ВКП(б) і таварыш Сталін. І мы гэту пастанову безумоўна павінны выканаць. Партыя кіравала, кіруе і будзе кіраваць работай совецкага, гаспадарчага і ўсякага іншага апарата.

Калі гэтыя недахопы мы мелі і маем яшчэ сям-там зараз, то іх трэба знішчыць, выправіць.

Некалькі слоў аб Чырвонай Арміі. Тут выступала многа ваенных таварышоў. Яны гаварылі ў сваіх выступленнях многа і поўна і правільна адносна задач, якія выпякаюць для комуністаў Чырвонай Арміі ў сувязі з усімі падзеямі, якія адбыліся за апошні час.

Таму я тут распаўсюджвацца не збіраюся. Мы павінны памятаць адно, таварышы — усе комуністы, што мы заўсёды павінны быць гатовы да вайны. І таму як можна хутчэй трэба ліквідаваць усе тыя вынікі, якія напісаны выкрытымі ворагамі народу Чырвонай Арміі, і ў тым ліку і ў нашай ВВА з боку выкрытага ворага народу Убарэвіча і некаторых іншых. І я думаю, таварышы, што наш Цэнтральны Камітэт, разам з ваенным акругай, ваенным советам ВВА, і ўся наша партыйная арганізацыя, грамадзянская і ваенная, прымуць усе меры да таго, каб гэтыя вынікі былі хутчэй ліквідаваны, каб наша ВВА была сапраўды перагавой, баявой акругай, гатовай ва ўсякі час даць адпор ворагу.

Я ўжо гаварыў у сваім дакладзе і запэўняў нашых ваенных таварышоў у тым, што мы, грамадзянскія работнікі, прымем усе меры, каб акружыць нашых кіруючых работнікаў Чырвонай Арміі і чырвонаармейцаў яшчэ большымі клопатамі, любоўю, увагаю і з боку партыйных арганізацый і з боку насельніцтва нашай Совецкай Беларусі.

Я думаю, што мы павінны ўсё зрабіць і для таго, каб грамадзянская партыйная арганізацыя ў гэтай дапамозе нашым ваенным таварышам усё зрабіла для палепшэння яшчэ большага аўтарытэту нашых камандзіраў, палітработнікаў у часцях Чырвонай Арміі. І, таварышы, несумненна, мы павінны ўсё зрабіць для таго, каб значэнне, вага, аўтарытэт кіраўніцтва нашай Чырвонай Арміі і кіраўніка Чырвонай Арміі тав. Варашылава, як палкаводца быў на недасяжнай вышыні. (Апладысменты).

Таварышы, пры ўсёй маёй пашане да КПК і да тав. Шуспіна, я павінен на яго выступленні крыху спыніцца, таму што гутарка ідзе аб некаторай я лічу прыцыповай, папраўцы, за якую, мне здаецца, не можа пакрыўдзіцца і тав. Шуспін. Я думаю, што ён не зусім правільна выступіў на з'ездзе, і вось чаму: на фоне ўсіх тых падзей, якія мы ўскрываем зараз у КП(б)Б і ў тым ліку і ў кіраўніцтве, мы, таварышы, павінны сказаць усе, што мы прахлопалі, што ў нас тут пільнасці неабходнай не было, што мы вінаваты, і няма ў нас і не можа быць герояў у тым сэнсе слова, што вось я — герой, я добра зыкрываў ворагаў. Не, вінаваты мы ўсе, і гэта трэба прама і адкрыта сказаць, і гэта адпавядае сапраўднасці, і гэтага патрабуе, тав. Шуспін, справа разгортвання большэвіцкай самакрытыкі.

Шуспін. — Правільна.

І калі гэта правільна, тав. Шуспін, то чы-жа можа быць тут КПК абыдзена, апаўважаны КПК.

Шуспін. — Я і на пленуме гаварыў

Тав. Шуспін, роля ўпаўнаважанага КПК вельмі зялікая, правы і абавязкі вельмі вялікія. Зразумела, адказнасць у першую чаргу ляжыць на ЦК КП(б)Б, на кіраўніках яго, але, зразумела, і ўпаўнаважаны КПК адказвае па сутнасці за работу.

Шуспін. — Я не знімаю адказнасці з сябе.

Не ў гэтым справа, але раз ўскрываюцца такія рэчы і факты, то к чаму гэтыя размовы, што вы недзе пісалі? Я вам скажу — глупства ўся гэта пісаніна ў параўнанні з тым, што мы зараз ускрываем у партыйнай арганізацыі.

Галасы. — Правільна, правільна.

Зразумела, вы пісалі, тав. Шуспін; нельга сказаць, што вы нічога не пісалі, не сігналізавалі, але не так і не ў такой плоскасці, як гэта зараз ускрываецца. Вы-ж не сігналізатары радавыя...

Голас. — Рабкоры.

Не радавыя члены партыі, якія сігналізуюць, а вы, па сутнасці, адзін з кіраўнікоў, і раз мы прахлопалі такія рэчы, то вінаваты ўсе мы, у тым ліку і вы.

Галасы. — Правільна.

І тут, па-мойму, нам няма чаго ў кусты хавацца ад адказнасці. Я хацеў зрабіць гэту заўвагу, тым больш, я лічу, што гэта зноў-такі звязана з разгортваннем большэвіцкай самакрытыкі. Выступленне тав. Шуспіна было не зусім самакрытычным.

Таварышы, пытанне аб выкрытых ворагах народу — Бенеку, Дзякаве, Убарэвічу і інш., зразумела, для нас, для партыйнай арганізацыі, з'яўляецца сур'ёзным пытаннем, таму што гэтыя людзі былі на кіруючай рабоце і ўваходзілі ў склад ЦК. Я ўжо гаварыў, што раз гэтыя асобы толькі зараз ускрываюцца, то мы вінаваты. Я не згодзен з устаноўкай некаторых выступаўшых таварышоў, што хтосьці камусьці перашкаджаў. Зараз гаварыць, што хтосьці камусьці «перашкаджаў» — няправільна будзе. Зразумела, труднасці і затрупненні ў выкрыцці гэтых ворагаў былі. Але чаму няправільна, таварышы, зараз так ставіць пытанне? Таму, што, я лічу, таварышы, такая пастаноўка пытання змазвае пытанне павышэння большэвіцкай пільнасці і разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі. Хіба можна зараз на з'ездзе гаварыць: перашкаджалі, хтосьці камусьці перашкаджаў? Мы так гаварыць не можам, бо гэтыя асобы аказаліся золатагамі, зараз выкрыты як ворагі. Мы не змаглі іх своечасова ўскрыць, як ворагаў і так мы павінны сказаць, не змаглі іх ускрыць і ў ЦК, з прычыны тых недахопаў, памылак, якія мелі месца ў КП(б)Б і ўскрыты ў дакладзе і заключным слове таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б). Іменна з-за гэтых недахопаў і памылак мы не змаглі своечасова іх ускрыць.

Гэта не значыць, таварышы, абсалютна, што наогул нічога не рабілася. ЦК КП(б)Б рабіў зельмі многа для таго, каб зыкрыць ворагаў і ў ходзе праверкі і абмену пасмыйных дакументаў выкрылі многіх ворагаў. Але гэта зусім не знімае віны з ЦК КП(б)Б, асабліва ў святле таго, што ўскрыта зараз. Размовы аб тым, што перашкаджалі і т. д. проста не к месцу. Мы павінны зноў-такі, паўтараю, сказаць, што не змаглі своечасова выкрыць гэтых ворагаў і паставіць аб іх пытанне. Гэта будзе адпавядаць поўнасцю сапраўднасці: тым больш, што аб такіх людзях, аб якіх гаварыў тав. Пасэ, — аб Бенеку, Дзякаве — быў цэлы рад матэрыялаў у ЦК, я аб гэтым гаварыў у сваім дакладзе. Але яны не былі пастаўлены як належыць, не быў пастаўлен адкрыта разгляд гэтых матэрыялаў.

Але, таварышы, я лічу, што мы не можам усё ў адну кучу валіць. Мы павінны ўсё-ж улічваць і глядзець: уся КП(б)Б вядае нашы кадры, і кіруючыя, і вядае, хто і як змагаўся супроць гэтых ворагаў — супроць трацкістаў, правых, нацыяналістаў і супроць усякай сволачы. Гэта для ўсёй КП(б)Б вядома. І многа такіх кадраў ёсць у КП(б)Б, абсалютная большасць, якія актыўна змагаліся супроць усёй гэтай сволачы. Так што зараз усё валіць у адну кучу было-б няправільна, і мы не можам скінуць з рахунку ўсяго гэтага актыва, які актыўна біўся супроць гэтых ворагаў.

Тут, таварышы, закранаўся персанальна рад людзей. У выступленні тав. Чунзерава гаварылася аб тав. Картукове. Бачыце, таварышы, зразумела, тав. Картукоў «па вушы» вінаваты за ўсе справы, якія зараз ускрыты ў Наркамземе. Ён штампаваў усе прапановы Бенека, ён бескантрольна праводзіў усё, што Бенек яму падсоўваў. Але я не згодзен з тав. Чунзеравым, калі ён так падыходзіць да справы: Картукоў, моў, меншавік. Перш за ўсё, Картукоў член партыі, комуніст. Калі вы хацелі сказаць, што ён быў меншавіком — гэта іншая справа, але калі вы гаворыце, што ён меншавік зараз, — гэта няправільна.

Чунзераў. — Практыка работы яго меншавіцкая.

Гэта — іншая справа. Але вы-ж не гаварылі аб практыцы работы, вы гаворыце, што ён меншавік.

Далей, адносна тав. Кудзелькі. Я не чуў выступлення Кудзелькі. Зразумела тав. Кудзелька на рабоце ў Наркамфіне дапусціў вялікую колькасць палітычных памылак. Гэта ўскрыта і па лепельскіх прыкладах, і на цэлым радзе другіх спраў. Тав. Кудзелька павінен быў тут сказаць аб сваіх памылках і як ён глядзіць на гэтыя рэчы. Гэтыя факты адносна тав. Кудзелькі трэба праверыць, гэта правільная пастаноўка з боку тав. Чунзерава.

Я, зразумела, у сваім заключным слове наменіў цэлы раздзел адносна выступлення Чарвякова на гэтым з'ездзе, але ў сувязі з тым, што Чарвякоў, як нам зараз ужо вядома, пакончыў самагубствам на асабістай глебе, мне думаецца, ніякай патрэбы многа гаварыць аб гэтым двурушніку, які маскіраваўся вельмі доўга ў КП(б)Б, які сваім актам самагубства, хоць і на асабістай глебе, зрабіў яўна варожы ўчынак. Ён нібы не вытрымаў той крытыкі, якая разгарнулася на нашым партыйным з'ездзе з боку членаў партыі, крытыкі вострай і зусім правільнай.

● **Мы ўсе вядаем, як Чарвякоў на ўсім працягу барацьбы КП(б)Б супроць яго памылак ніколі не быў шчырым у сваіх тлумачэннях перад партыяй. Ён заўсёды двурушнічаў. Ён заўсёды манеўраваў з адвакацкімі ўлоўкамі і вывёрткамі. Мне і многім з нас даводзілася часта прыходзілася крытыкаваць Чарвякова, і ніколі мы не сустракалі з яго боку шчырасці ў адказах на гэту крытыку. У нас ніколі сумненняў не было, што кожны раз, калі Чарвякоў павінен быў трымаць адказ перад партыяй, ён заўсёды выступаў як адрад партыяй, ён заўсёды выступаў як адвакат, чыноўнік, які навучыўся вельмі лёгка, па-адвакацку загладжваць, абыходзіць, дыпламатычна павярнуць і прыкідзіць, дыпламатычна павярнуць і прыкінуцца навінненькім, прыбедніцца. Ён так зрабіў і тут, на нашым з'ездзе — прыбедніўся і вось — яму цяжка і т. д. і т. д.**

Хто не ведаў Чарвякова, які яшчэ ў былыя часы на з'ездах партыі ўмеў гаварыць і ўмеў грамець тых людзей, якія выступалі супроць яго і выкрывалі яго пасмыкі. Ён не выступаў тады такім бедненькім, прыбядніўшымся, як тут выступаў. Ён людзей, якія мала-мальскі выступалі супроць яго, зашыбаў і вышыбаў умомант. Не такі Чарвякоў быў бедненькі.

● Таварышы, вазьміце тое, што ён тут гаварыў аб Галадзеду. Мяне проста здзівіла. Чалавек ён палітычна граматны. Чалавек бачыць, што Галадзеда на з'ездзе выкрываюць як правага па канкрэтных матэрыялах; Чарвякоў-жа ўхітрыўся, гаворачы аб Галадзеду, пабудаваць сваю прамову так, каб самому вылезці на паверхню, пабудаваў сваю прамову на асабістых адносінах з Галадзедам, не крытыкаваў яго палітычна, не выкрываў правыя справы Галадзеда.

Каму не вядома, што Чарвякоў з Галадзедам разам насаджалі прышчэпаўшчыну; каму не вядома, што яны ўсе дакументы апрабіравалі, будучы ля ўлады, багатварылі Прышчэпава. А хіба ўсе правыя справы Галадзеда Чарвякову не вядомы лепш, чым каму? Яму вядомы лепш. Ён ухітрыўся на з'ездзе, гаворачы аб Галадзеду, прадставіць сябе такім чынам: які я быў пакрыўджаны Галадзедам, Галадзед мне жыць не даваў. Усе гаварылі, а Чарвякоў Галадзеда не выкрываў. Так-жа. Ці не выходзіць тут па прыказцы: рыбак рыбака бачыць здаляка. Асабіста парапэліся, а работу совецкага апарата, работу, якую яны ўзначальвалі, разам праваліці.

Таварышы, ва ўсякім выпадку я абсалютна ўпэўнен, што і наш з'езд, і ўся наша КП(б)Б, і ўвесь народ Беларусі сустрануць, апэнаць павезамленне аб самагубстве Чарвякова як яго варожы акт, акт супроць партыі, супроць совецкай улады, супроць народу, супроць усіх нас.

Галасы. — Правільна.

Таварышы, я думаю, што мне няма патрэбы тут спыняцца адносна Галадзеда, таму што аб ім дастаткова і правільна гаварылі, і да таго, што я гаварыў у сваім дакладзе, і да таго, што тут гаварылі, няма патрэбнасці рабіць дапаўненне.

XVI з'езд КП(б)Б увойдзе ў гісторыю КП(б)Б безумоўна як гістарычны з'езд. Ён увойдзе ў гісторыю КП(б)Б як з'езд згуртавання нашых радоў, як з'езд павышэння большэвіцкай мабілізаванасці і пільнасці, як з'езд, які бязлітасна, востра ставіў ва ўпор пытанне ўсім тым, хто тармазіў нашае социялістычнае будаўніцтва, як з'езд ачысткі КП(б)Б ад ворагаў, як з'езд ачысткі КП(б)Б ад усяго нягоднага, што перашкаджае паспяховаму ходу нашага социялістычнага будаўніцтва.

Няма сумнення, таварышы, што работа і рашэнні XVI з'езда КП(б)Б дапамогуць нам і ўсёй КП(б)Б, усім прапоўным Беларусі яшчэ больш рашуча ачысціць свае рады ад усіх ворагаў, дыверсантаў, шпіёнаў, агентаў японска-германскага, польскага фашызма, якія заселі ў тых ці іншых месцах нашых апаратаў, якія шкодзяць нам.

Няма ніякага сумнення ў тым, што наш з'езд, наша КП(б)Б прымуць усе меры да таго, каб рашэнні Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), указанні таварыша Сталіна ў яго дакладзе і заключным слове беззаветна, самааддана, з усёй энергіяй і сілай, якая ў нас ёсць, праводзіць у жыццё.

Таварышы, я думаю, што XVI з'езд КП(б)Б з'яўляецца з'ездам яшчэ большага згуртавання радоў КП(б)Б вакол Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай комуністычнай партыі, вакол любімага, дарагога нашага правадыра таварыша **Сталіна. (Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты. Усе ўстаюць. Воклічы: «Ура», «Няхай жыве таварыш Сталін», «Ура таварышу Сталіну». Бурная, доўга незмаўкаючая авацыя. «Няхай жыве ЦК ВКП(б), таварыш Сталін», «Ура». Бурныя апладысменты. Усе пяюць «Інтэрнацыянал». Воклічы: «Таварышу Сталіну — ура», «Няхай жыве таварыш Сталін», «Ура». Бурная авацыя. «Няхай жыве комунізм», «Ура». Бурныя апладысменты. «Ура—слаўным чэкістам». Бурныя апладысменты).**

У ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне аб другім скліканні Вышэйшай (распубліканскай) школы прапагандыстаў. Кантынгент набору ўстаноўлен у 100 чалавек.

Школа прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б ставіць сваёй задачай падрыхтоўку выкладчыкаў па гісторыі ВКП(б), загадчыкаў культпропадзелаў райкомаў партыі, загадчыкаў парткабінетаў і раённых прапагандыстаў. Тэрмін абучэння ў школе ўстаноўлен у адзін год і 3 месяцы. У школу прымаюцца члены КП(б)Б са стажам не менш 6 год і маючыя 3-гадовы стаж кіруючай партыйна-комсамольскай прапагандысцкай работы. Узрост іх не павінен перавышаць 35 год.

Паступаючыя ў школу павінны мець агульнаадукацыйную падрыхтоўку ў аб'ёме сямігодкі і партыйна-палітычную ў аб'ёме комвуза або соўпартшколы 2-й ступені.

У лішені будуць праведзены іспыты для ўсіх залічаных мандатнай камісіяй.

Таварышы, прынятыя мандатнай камісіяй атрымліваюць месячны водпуск па месцы пастаяннай работы для падрыхтоўкі.

Слухачамі школы залічаюцца таварышы, якія здалі іспыты, і зацверджаныя бюро ЦК КП(б)Б.

Для слухачоў школы прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б устаноўлена стыпендыя ў суме 450 руб. у месяц. Прадастаўляецца інтэрнат. Сем'і слухачоў жыллёвай кв забяспечваюцца.

Пачатак вучэбнай работы — 1 верасня.

ЦК КП(б)Б у гэтым-жа рашэнні замацаваў за школай рад выкладчыкаў, як пастаянных работнікаў школы.

Для адбору кандыдатур на мясцах каманцыруецца група кіруючых работнікаў Аддзела партпрапаганды і агітацыі, школы прапагандыстаў і інш.

Апрача гэтага, заявы аб жаданні паступіць у Вышэйшую школу прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б могуць накіроўвацца непасрэдна ў Аддзел партпрапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б.

Совецкі народ ганарыцца адвагай герояў гістарычнага пералёту

ПЕРАЛЁТ ТРОХ ГЕРОЯЎ

Яшчэ на востраве Рудольфа перад адлётам на Паўночны полюс мы даведаліся аб рыхтуючымся пералёце герояў Совецкага Саюза Чкалава, Байдукова і Белякова праз Паўночны полюс. З велізарным нецярпеннем мы чакалі старта гэтага небывалага ў гісторыі авіяцыі палёту. І вось старт дан.

Нам ужо малюецца цудоўныя перспектывы, адкрываючыяся гэтым пералётам. Бяспасадачны пералёт Масква—Сан-Францыска ўшчыльную падводзіць авіяцыю двух магутных краін да ўстанаўлення рэгулярных паветраных трансарктычных зносін паміж Еўропай і Амерыкай. І калі работу паўночнай экспедыцыі можна расцэньваць у некаторай ступені як базу арганізацыі такіх зносін, то палёт Чкалава, Байдукова і Белякова з'яўляецца першым рэйсам па будучай міжнароднай трасе.

Арганізацыя такой трасы з'яўляецца ўпаўне рэальнай і можа быць ажыццёўлена ўжо ў самы бліжэйшы час. Палёт Чкалава, а таксама палёты на Паўночны полюс паказваюць, што ў нас ёсць лётны склад, здольны лётаць праз Цэнтральную Арктыку, што мы маем матэрыяльную часць, якая здольна бездаказна прапаваць ва ўмовах Цэнтральнай Арктыкі, што тэхнічная арганізацыя земнага абслугоўвання трансарктычных рэйсаў для нас ясная. Другімі словамі: мы маем усе неабходныя прадпасылкі для таго, каб на працягу бліжэйшых трох год арганізаваць рэгулярныя — спачатку паштовыя, а затым і пасажырскія — паветраныя зносіны паміж СССР і Амерыкай.

З усіх высоўваючыхся за апошні час варыянтаў трасы Еўропа — ЗША найбольш выгаднай для эксплаатацыі з'яўляецца траса, праходзячая праз Паўночны полюс.

Як нам уяўляецца, будучая траса пройдзе праз наступныя пункты: Масква — Архангельск—в. Рудольфа—Паўночны полюс — Аклавік — Сан-Францыска. Пры такой разбіўцы не будзе патрэбы запаўняць самалёты толькі гаручым; яны змогуць узяць грузы.

Мэтазгодна мець некалькі запасных абходных варыянтаў трасы на выпадак выключна неспрыяючага надвор'я на асноўных участках. З совецкай стараны такімі абходнымі варыянтамі могуць служыць участкі ад Архангельска на в. Дзіксон — мыс Молатава (значная частка гэтага шляху вельмі добра вядомч совецкім пілотам). Такі-ж абходны шлях мэтазгодна распрацаваць і для амерыканскай стараны.

Эксплаатацыя трасы не патрабуе якіх-небудзь асобых тыпаў самалёта. Тут упаўне змогуць лятаць двухматорныя машыны, падымаючыя тону камерцыйнага груза плюс усё неабходнае абсталяванне і снаряжэнне для палётаў ў Арктыцы. Крайсерская хуткасць машын павінна быць каля 350 кіламетраў у гадзіну, а практычны паталок — да 5.000 метраў. Самалёты падобных тыпаў совецкая прамысловасць ужо выпускае.

Канструктарам прыдзецца асабліва папрацаваць над стварэннем непрыліпаючых лыж, каб аблегчыць старт цяжка нагружанаму самалёту на ліпкім снезе.

Палярныя станцыі, пабудаваныя за апошнія гады ў совецкім сектары Арктыкі, забяспечваюць метэаралагічнае абслугоўванне трасы ад Масквы да полюса. З боку Грэнландыі і Канады справа абстаіць горш. Арганізуючы паветраныя зносіны СССР — ЗША, прыдзецца пабудаваць хоць-бы па адной палярнай станцыі ў паўночнай частцы Грэнландыі і на адным з астравоў Грэнландскага архіпелага. Апрача таго, неабходна стварыць мінімум тры метэапасты з запаснымі аэрадромамі ў Цэнтральным палярным басейне. Арганізацыя гэтых пастоў — справа ўпаўне магчымая і тэхнічна ажыццявімая.

Натуральна, усе аэрапасты павінны быць абсталяваны магутнымі радыёмаякамі і абсталяваннем для сляпой пасадкі і ўзлёту. Наогул кажучы, тэхнічнае абсталяванне наземных баз павінна быць выканана па ўзору базы вострава Рудольфа, якая ў часе нашай экспедыцыі дазваляла выпускаць у паветра адначасова цэлы атрад цяжкіх караблёў.

Уся гэта праграма — пад сілу нашай магутнай індустрыі, вырасшай і ўзмацнеўшай пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна. Гэту праграму, як я гаварыў ужо, можна ажыццявіць на працягу бліжэйшых трох год.

Пералёт Чкалава, Байдукова і Белякова ўпісвае новую слаўную старонку ў кнігу вылатных перамог Совецкага Саюза. Калі супастаўляем палёты нашых караблёў на Паўночны полюс і паветраныя парады нах Краснай плошчай, мімаволі ўспамінаем словы правадыра Чырвонай Арміі тав. К. Е. Варашылава аб тым, што хто моцны ў паветры, той у наш час наогул моцны.

ШЗВЕЛЕЎ,
Намеснік начальніка экспедыцыі на Паўночны полюс.

Амдэрма, 20 чэрвеня. (Па радыё).

КРАЇНА ШЧАСЦЯ І ПЕРАМОГ

З вялікай цікавасцю і захапленнем сачылі мы за грандыёзным пералётам Герояў Совецкага Саюза тт. Чкалава, Байдукова, Белякова па маршруту Масква—Амерыка праз Паўночны полюс. Гэты пералёт — буйнейшая перамога сусветнай навукі і тэхнікі. Мы ганарымся тым, што яна заваявана совецкімі грамадзянамі, сталінскімі выхаванцамі.

Мы былі ўпэўнены ў гэтай перамозе. У Краіне Советаў, якая жыве пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, даны ўсе ўмовы да развіцця творчых здольнасцей грамадзян краіны. Гэтая перамога — звяно ў агульным ланцугу найвялікшых перамог ва ўсіх галінах працы, навукі, тэхнікі, мастацтва, якіх дабіліся шчаслівыя грамадзяне Краіны Советаў пад кіраўніцтвам усімі любімага правадыра роднага Сталіна.

Аб нашых заваёвах і рэкордах веде ўвесь свет і імі ганаранца прапоўныя ўсяго свету, хапя фашысцкі прадажны друк прымае ўсе захады да таго, каб змаўчаць аб нашых перамогах.

Мы цвёрда ўпэўнены, што ўслед за гэтым нечуваным у гісторыі пералётам пасцелуюць новыя, яшчэ больш грандыёзныя подвігі совецкіх людзей. Наша Краіна Советаў — гэта краіна шчасця і перамог

Наш абавязак, як стаханаўцы,—множыць гэтыя перамогі на сваіх участках работы. Прыложым усе сілы да таго, каб нашу фабрыку ператварыць у стаханаўскую.

Стаханаўцы менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча:
СКАБЛО З., РОЗЕНБЕРГ С., ФЕЛЬДМАН. БАТВІНІК Х., ЧЭРАПАХІНА Х., БЕРНШТЭЙН Л., ЛІПКЕР Г.

СЛАВА ГОРДЫМ СОКАЛАМ

Разам з прапоўнымі Совецкага Саюза і ўсяго свету байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі захоплены гераічным пералётам экіпажа «АНТ-25» Герояў Совецкага Саюза т.т. Чкалава, Байдукова і Белякова.

Калі радыё прынесла радасную вестку аб добрай пасадцы самалёта паблізу Портланда, не было межаў захапленню нашымі гордымі сокаламі. Гэта вестка ў момант аблянела ўсе часці. Кожны чырвонаармеец, дзе-б ён ні знаходзіўся, даведаўся аб пасадцы самалёта ў Амерыцы і з найвялікшай гордасцю за сваю радзіму, за нашых вылатных лётчыкаў, за нашы дасканалыя машыны, выказвай свае пачуцці.

Вось чырвонаармеец часці, дзе заенком тав. Мандрык—тав. Кафанаў гаворыць: «Я бязмежна рад за нашых лётчыкаў. Яны сапраўды творацъ цуды. Ні адна другая краіна не можа зрабіць такога пералёту. Толькі краіна Советаў, вызваліўшыся ад векавога рабства, кіруемая нашай слаўнай партыяй Леніна—Сталіна, нашым любімым правадыром тазарышам Сталіным, выхавала такіх адважных герояў, якім няма ніякіх перашкод і якія працуюць не на карысць кучкі людзей, а дзеля інтарэсаў усяго грамадства, на карысць комунізма. Слава нашым Героям—Чкалаву, Белякову, Байдукову.

Курсант школы той-жа часці т. Ліжыеў заяўляе:

— Мы, байцы Чырвонай Арміі, вучымся ў адважных лётчыкаў, як трэба адносіцца да выканання сваіх заданняў у справе ўмацавання баявой магутнасці РСЧА. У патрэбную мінуту, па прыкладу Чкалава, Байдукова і Белякова, мы з гонарам выканаем заданне ўрада ў абароне нашай краіны і праявім небывалы яшчэ гераізм у апошній і рашучай схватцы з капіталам. І мы пераможам!

Капітан т. Свечнікаў гаворыць:

— У мяне няма слоў, каб выказаць маё найзялікшае захапленне грандыёзным пералётам нашых адважных герояў-лётчыкаў, праклаўшых упершыню ў сусветнай гісторыі шлях праз дах свету—Паўночны полюс—у Амерыку. Я ганаруся, што я з'яўляюся таксама сынам нашай вялікай радзімы, выхаваўшай Герояў Совецкага Саюза Чкалава, Белякова і Байдукова.

Ва ўсіх часцях праведзены палітінфармацыі па пытанню аб пералёце. Праводзяцца гутаркі з глобусам і картай аб значэнні пералёту, аб нашых слаўных героях-лётчыках, праклаўшых паветраны шлях з СССР у Паўночную Амерыку, праз Паўночны полюс.

На прыкладзе адвагі і гераізма Герояў нашай радзімы выхоўваецца наша слаўная Чырвоная Армія, расце і ўмацоўваецца яе магутнасць, і ўсякі вораг, які паспрабуе напасці на нашу краіну, будзе разбіт і знішчан да канца.

Ал. ШПІТАЛЬНЫ.

ДАКАЗАЛІ ВЕЛІЧ СОВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ

Вестка аб поспеху бяспрыкладнага гераічнага пералёту Масква — Паўночны полюс — Паўночная Амерыка літаральна захапіла мяне.

Совецкія героі Чкалаў, Байдукоў, Белякоў яшчэ раз даказалі ўсяму свету на што здольны людзі, узрошчаныя комуністычнай партыяй, вялікім Сталіным. Іх подвіг натхніе нас, акцёраў, паказаць у мастацкіх вобразах велічы совецкіх лётчыкаў, іх беззаветную адвагу і адданасць соцыялістычнай радзіме.

ДАБРАВОЛЬСКІ — акцёр Украінскага дзяржаўнага тэатра г. Сталіно.

ПЕРАЛЁТ, ЯКІ ВЫКЛІКАЕ ГОРДАСЦЬ

У той момант, калі фашысцкія чорныя вораны засыпаюць бомбамі безабаронныя іспанскія вёскі і гарады, — нашы совецкія лётчыкі ўпісалі ў кнігу сусветнай культуры новую яркую старонку, звазаўшы прамой дарогай праз нязведаныя прасторы 2 дзяржавы, аблегчыўшы культурную і эканамічную сувязь паміж імі.

Прывет гордым сокалам нашай радзімы! Іх смелы пералёт выклікае пачуццё гордасці за нашу вялікую совецкую краіну, за наш народ, за нашу партыю.

АРЛОЎСКІ — акцёр Украінскага дзяржаўнага тэатра г. Сталіно.

Момант узлёту «АНТ-25» на Шчэлкаўскім аэрадроме. Фото С. Ласкутава (СФ).

В. ЧКАЛАЎ

Герой Совецкага Саюза

ПРАЗ ПОЛЮС НЕДАСТУПНАСЦІ*)

Трэніровачныя палёты закончаны. Ідзе апошняя падрыхтоўка матэрыяльнай часці —яшчэ і яшчэ раз абслугоўваючы персанал, інжынеры і спецыялісты правяраюць механізмы і работу прыбораў. Рамантуецца асфальтавая дарожка для ўзлёту, бо ў гэтым годзе палётная вага машыны будзе большая, чым у мінулым. Тлумачыцца гэта тым, што мы бярэм з сабой павялічаны недатыкальны запас, лодкі, палаткі, палярнае абмундзіраванне, прылады і т. д.

У нас строгі рэжым. Мы праводзім час дакладна па распісанню ўрача, не адхіляючыся ад яго ні на ёту. Арганізм павінен добра адпачыць. Несумненна, у палёце спаць ніхто з нас не зможа, вопыт мінулага года гаворыць аб гэтым. Дарэмна тады кожны з нас, свабодны ад вахты, прабаваў хоць ледзь уздрамнуць — вочы закрыты, але галава і нервы ўвесь час у напружаным становішчы.

Карты раскладзены на стале. Наш слаўны штурман — у каторы раз!—прапрацоўвае маршрут. Кожны дзень сістэматычна мы трэніруемся па перадачы і прыёму радыё. Ствараючы штучныя атмасферныя перашкоды, мы стараемся наладзіць сувязь, прабіцца скрозь «буры». Байдукову ў палёце прыдзецца песці на чарзе і штурманскую вахту. Кожны з нашага экіпажа, у выпадку чаго, зможа замяніць таварыша: калі Байдукоў можа выконваць ролю штурмана і радыста, то Белякоў у сваю чаргу можа зесці машыну. Гэта ў такім адказным пералёце, па нашай думцы, абавязковая ўмова.

З мінулага года ў канструкцыі нашага «АНТ-25» праведзены некаторыя ўдасканаленні і палепшанні. Любая дробязь іншы раз можа даставіць шмат непрыемнасцей. У трэніровачных палётах мы неяк не заўважылі некаторых дробных нязгод, але ў палёце гэта лала сябе адчуць. Дрэнна, напрыклад, што не было дзе выпягнуць ногі. Гэта зельмі непрыемнае адчуванне: ўвесь палёт быць у скурчаным становішчы. Прышлося перарабіць пілоцкае сядзенне, яно было нязручным. У мяне ў палёце зводзіла нагу, асабліва правую. І замест дванаццаці нам прыходзілася мяняцца праз кожныя тры тадзіны...

Унесены яшчэ сякія-такія дробныя, але важныя змены. Наша машына стаіць у чаканні.

А пакуль мы адпачываем. Добра і рэгулярна харчуемся. Адсыпаемся, плаваем, катаемся на лодцы, стараемся не адрываць увагу на пабочныя рэчы. Урадам створаны абсалютна ўсе жаданьня і магчымыя ўмовы для нашага адпачынку.

Хутка мы адарвемся ад асфальтавай дарожкі Шчэлкаўскага аэрадрома. Наш маршрут ляжа праз полюс недаступнасці. Як вядома, Герой Совецкага Саюза тав. Леваневускі на гэтай-жа самай машыне збіраўся перасекчы Паўночны полюс яшчэ два гады таму назад. З-за некаторых перашкод яму прышлося вярнуцца назад. Яго шлях ляжаў па прамой: Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка. Наш маршрут мае некалькі іншае начартанне. Пакідаючы тыя-ж канечныя пункты, мы спачатку будзем трымаць курс на Зямлю Франца-Іосіфа і ўжо адтуль прама і няўхільна па 120-й паралелі, перасякаючы Ледавіты акіян, ля Мядзвежага возера, Паўночны палярны круг, хрыбты Скалістых гор, выйдзем на Сан-Францыска. Ад шіхага, квітнеючага рускага лета, скрозь холад, пургу і каварства Поўначы мы пападзем на паўнёвае акіянскае ўзбярэжжа Злучаных Штатаў Амерыкі.

Упершыню ў гісторыі чалавецтва нам прыдзецца перасекчы «Полюс Недаступнасці», дзе ніколі і ніхто яшчэ ні разу не бываў. Як вядома, існуюць чатыры полюсы: геаграфічны, магнітны, полюс недаступнасці і холаду. Становішча геаграфічнага полюса ўсім вядома—ён размешчан ва ўяўляемай кропцы праходжання Земнай асі. Магнітны полюс знаходзіцца ў раёне Бафінавай Зямлі, на поўначы Амерыкі. Полюс холаду—у Якуціі, а полюс Недаступнасці абазначан на ўсіх геаграфічных картах свету белай плямай.

На алюмінаторным самалёце нам прыдзецца перасекчы ўпершыню гэтую пляму. Ніхто не ведае, якія перашкоды і падкопы чакаюць нас на гэтым участку шляху.

Мы тамарымся тым, што нам выпаў гонар першым раскрыць тайну белай плямы нашай планеты.

Увесь шлях мы павінны прайсці без пасадкі. Пасадка ў тых умовах (а мы ўлятаем на калёсах) была-б надзвычайна небяспечнай. Аднак, мы цвёрда ўпэўнены ў якасці нашай айчыннай прадукцыі. Матор, неаднаразова выпрабаваны намі ў паветры, працуе бездакорна. Адналаторнасць канструкцыі, вядома, прадыктавана тым, што адзін матор менш пажырае гаручага, сама канструкцыя ад гэтага палягчаецца, а тое месца, якое мог займаць другі матор, зручней запоўніць дабавачным бакам. А адзін кілограм гаручага — гэта тры лішніх кілометры шляху! У даным выпадку канструкцыя машыны разлічана, галоўным чынам, на працягласць прабывання яе ў паветры.

На самалёце совецкі матор, пабудаваны на заводзе імя Фрунзе. Матор, дастатказа вядомы і неаднаразова даказаўшы свае высокія рабочыя якасці і эфектыўнасць. Трохлопасны металічны вінт, які не баіцца абледзянення, забяспечвае спакойную работу нашага магутнага матора. Совецкая прамысловасць снабдзіла нашу экспедыцыю самым дасканалым абсталяваннем, пачынаючы ад матора і канчаючы самымі дробнымі аэранавігацыйнымі прыборамі.

Для магчымага палёту на вялікай вышыні мы бярэм з сабой кіслародныя прыборы. Намі распрацаван папярэдні графік зручных вышынь пералёту, якога мы пастараемся прытрымліваца на ўсім шляху. Несумненна, нам будуць сустракацца ўсялякія метэаралагічныя перашкоды, але кожны з нас мае за плячыма дастатковы вопыт у сваёй спецыяльнасці. Мы не баімся стыхіі. Розум чалавека перамагае неарганізаваную прыроду.

Нядаўна мы прысутнічалі на пасяджэнні ўрада, дзе разглядалася наша дакладная запіска і варыянт пералёту. Мы ўлятаем, упэўненыя ў сваёй перамозе. Большэвікі сатруць з Зямлі ўсе белыя плямы.

Наша пастаянная мысль у паветры будзе аб нашай вялікай, непераможнай радзіме, аб нашых дзецях, слаўнай комуністычнай партыі і любімым таварышу Сталіне, лепшым другу лётчыкаў.

Прызітанне радзіме!

*) Артыкул напісан Героем Совецкага Саюза В. Чкалавым перад стартам бяспрыкладнага пералёту Масква—Паўночны полюс — Паўночная Амерыка.

ХВАЛЯВАННЕ

У трохпавярховы жылы дом на Першамайскай вуліцы гэту патрасаючую навіну першым перадаў рэпрадуктар. Звычайны спакойны голас дыктара на гэты раз узарваў раніпнюю цішыню другога паверха. Малады слесар-лекальшчык, які кожнае ранне займаўся фізкультурай пад радыё, энергічна забарабаніў суседзям:

— Чулі? усхвалявана гаманіў ён. — Я запытваю, чулі?..

З глыбіні кватэры нейчы голас незадоволена забурчаў.

— Хто там грукае? Вечна спакою няма...

У карыдоры захапзілі. З кухні выбеглі жанчыны. Узніклі гутаркі, тупанне, шум.

— Чулі? — барабаніў лекальшчык. Да дзвярэй яго пакоя падыходзілі жыхары.

— От, неўгамонны, — заўважыла жанчына з чайнікам.—Што здарылася?

Лекальшчык адчыніў дзверы, як быў у трусах і саколцы, забыўшы нават апрануцца.

— Паляцелі... загаварыў ён, — толькі што перадавалі па радыё... У Амерыку праз Паўночны полюс. Вы ўяўляеце?.. Чкалаў, Белякоў, Байдукоў...

Падышоўшы пажылы, спакойны чалавек з дакорам глянуў на жанчыну з чайнікам:

— Заўсёды ты выключаеш на ноч рэпрадуктар... Такую навіну прапусцілі, ай-яй-яй.

Хутка ўвесь дом гаварыў пра надзвычайны пералёт.

Ды не толькі гэты жылы дом, — увесь горад, уся краіна знаходзілася пад уражаннем бяспрыкладнай адвагі совецкіх лётчыкаў.

Ля газетных кіёскаў тоўпіліся людзі, нецярпліва чакаючы свежую пошту. У трамваях, на рабоце, за сталамі аўдыторый інстытутаў, у пэхах заводаў, на вуліцах, ля прылаўка ў магазінах — усюды чуліся словы шчырага захаплення і радасці за новую перамогу. Кароткахвалевікі прашчупвалі эфір — перахапіць хоць-бы урывачак з радыёграм. Дзяці са сваёй невычарпальнай фантазіяй прыдумвалі новыя гульні і самаму бойкаму і паважанаму з дзетвары аддавалі ролю Чкалава. У гутарках падчас праскальзвала затоеная трывога, паўставала штогадзінна неадвязнае пытанне:

—Дзе яны зараз?

Можа праразае чырвонакрылы самалёт густыя хмары над Паўночным полюсам і чапёрка адважных зімоўшчыкаў на дрэйфуючай ільдзіне прагна слухае пераможны гул матора. Або імчыцца далей — па той бок зямнога шара над непрыветным акіянам, над заледзянеўшымі астравамі Канадскага архіпелага, з небывалай дзерзасцю абуджаючы векавую маўклівасць Арктыкі. Усюды, дзе-б ні быў самалёт — ці над Паўночным полюсам, ці над халодным узбярэжжам Канады, ці над скалістымі хрыбтамі Кардзільераў — усюды з яго экіпажам былі лепшыя думкі і пачуцці кожнага грамадзяніна вялікай радзімы. Невыказнай любоўю былі акутаны Героі, што заваёўвалі нязведаныя прасторы.

Буднічны вечар наплываў на горад. Успыхвалі вуліцы пералівам электрасвятла. Вабілі асветленыя тэатры і кіно, упругожаныя сады і паркі. Людскія струмені залівалі вуліцы. Горад жыў звычайным жыццём. Але наўрад ці былі такія, хто гэтым вечарам не ўспомніў-бы пра мужную тройку, якая ўжо другія суткі нястомна вяла самалёт наперад. Унізе змяняліся пейзажы, блыталіся поры году, плылі насустрач густыя хмары, бушаваў шквалісты вецер, а самалёт імчаў усё далей і далей скрозь хмары, вецер, непагоду. Думаючы пра іх, кожны адчуваў, як хвалюе і ўзнімае настрой гэты нечуваны прыклад гераізма, як часцінка іх мужнасці і адвагі перадаецца кожнаму, акрыляючы новым прылівам творчай энергіі.

Ля газетнай вітрыны група моладзі разглядае карту з маршрутам пералёту. Высокі хлапец, трымаючы адной рукой кнігі, другой паказвае на Паўночнае ўзбярэжжа Канады.

— Напэўна яны ўжо тут... Валя, раскажы, што з сябе ўяўляе востраў Патрыка,—звяртаецца ён, пад усмешкі таварышоў, да светлавалосай дзяўчыны.

— Пачуеш на заліках, — ухіляецца яна, — экзаменатар...

— А ўсё-ж не лёгка ім весці самалёт па нязведанай трасе — прапягвае хлопец. Цень задумёнасці прабягае па тварах моладзі.

У парку па жоўтай дарожцы між зеляніны кустоў і дрэў малодая жанчына вядзе за руку хлопчыка гадоў сямі. Ля дарожкі на ўпрыгожаных падстаўках вывешаны партрэты Герояў Совецкага Саюза.

— Дык дзе Чкалаў? — запытвае маці.

— Во!.. — беспамылкова паказвае хлопчык.

— Далёка яны цяпер, — дадае маці.

— У Амерыцы... — лезь вымаўляе хлопчык. Мама! Я ўбачу Чкалава, калі ён звернецца?..

— Убачыш, абавязкова ўбачыш...

У кватэрах гэтай ноччу і наступнай раніцай не выключалі рэпрадуктараў. Жыхары баяліся прапусціць хоць адно паведамленне пра пералёт. Хоць надзвычай моцнай была ўпэўненасць, усё-ж часам урывалася неспакойная думка: не здарылася-б чаго на шляху. Яшчэ і яшчэ раз хацелася пачуць з эфіра, чытаць, бачыць, адчуваць славутыя два словы «Усё ў парадку», якія прагна лавілі радыёстанцыі ўсяго свету. Самалёт пакрываў апошнія сотні кіламетраў. У самых далёкіх кутках неабсяжнай радзімы людзі непярпліва чакалі паведамлення і цвёрда верылі, што і апошняе паведамленне закончыцца лаканічна і проста: «Усё ў парадку».

— Селі, — сказаў на другі дзень, прыйшоўшы з работы, слесар-лекальшчык пажылому чалавеку, што лаяў жонку за выключаны рэпрадуктар. У вачах лекальшчыка бліснулі радасныя аганьки.

— Чуў яшчэ раніцай, — з гонарам адказаў той і далаў: — нават учора не сумняваўся, што ўсё абыйдзецца як след...

— Селі, брат, — паўтарыў лекальшчык. — Эх, і абняў-бы зараз іх, — пацісну-ў-бы рукі ад душы, ад усяго сэрца.

— Слаўныя рабяты, што і казаць...— задумёна сказаў яго субяседнік.

Тар. ХАДКЕВІЧ.

ЛЕПШЫЯ ПАТРЫЁТЫ НАШАЙ РАДЗІМЫ

Тры Героі—Чкалаў, Байдукоў і Белякоў паказалі, на што здольны совецкія людзі, як далёка шагнула наша совецкая авіяцыя. Цяжэйшы пералёт завершан.

Бясстрашныя сыны нашай краіны, лепшыя яе патрыёты дабіліся такога поспеху толькі таму, што былі ўпэўнены ў сваіх сілах, выдатна авалодалі сваёй справай. Яны гарэлі жаданнем выканаць заданне таварыша Сталіна.

Наша соцыялістычная краіна выкоўвае з дня ў дзень многа герояў і смельчакоў з большэвіцкай воляй. Гарачая любоў да радзімы, да комуністычнай партыі нараджае тысячы Чкалавых, Байдуковых і Беляковых.

Мяне таты геройскі пералёт натхняе на перамогу ў пралстаячых скарасных сустрачных аўта-мотагонках па маршруту Менск — Масква. Уся мая каманда цвёрда рашыла дабіцца пяршынства ў гэтых спаборніцтвах.

Сёння ноччу мы стартуем у 800-кіламетравы шлях. Мы памятаем абавязковыя ўмовы, якія неабходны ў перамозе: стрыманасць, самаўладанне, смеласць, самаадданасць, веданне сваёй справы.

Лейтэнант В. І. ВЕРАЦІЛЕНКА.
Рэкардсмен СССР па мотаспорту, капітан менскай каманды мацыкліста.

АВАЛОДВАЦЬ ЛЁТНЫМ МАЙСТЭРСТВАМ

З напружанай увагай сачылі мы за пералётам Герояў Совецкага Саюза Чкалава, Байдукова, Белякова. 20 чэрвеня раніцою радыё прынесла нам радасную вестку: адважная тройка паспяхова прызямлілася на амерыканскім матэрыку.

Гэта вестка выклікала ў нас буру захаплення. Мы горды і бязмежна рады за нашых слаўных герояў-лётчыкаў. Іх пералёт служыць для нас, вучлётаў, выдатнейшым узорам як трэба авалодаць лётнай справай, як трэба перамагаць найвялікшыя цяжкасці ў дасягненні сваёй мэты.

Натхнёныя гераізмам сталінскіх пітомцаў мы з яшчэ большай упартасцю будзем авалодваць лётным майстэрствам, будзем яшчэ больш мацаваць абаронную магутнасць нашай вялікай радзімы.

СЫЗУК Т.
ЗІНОВІЧ І,
Вучлёты-выдатнікі менскага цэнтральнага аэраклуба імя Молатава.

БЛІСКУЧЫ ПРЫКЛАД ДЛЯ МОЛАДЗІ

Нашы слаўныя лётчыкі, адважныя сокалы сталінскай вывучкі — Героі Совецкага Саюза Чкалаў, Байдукоў, Белякоў, зрабілі бяспрыкладны подвіг, праслаўляючы нашу вялікую радзіму, паказваючы бязмежныя магчымасці, якія крыюцца ў нашым совецкім народзе.

Смеласць, адвага, любоў да радзімы і служэнне лепшым ідэалам чалавецтва ў яго барацьбе са стыхіяй — вось з якіх элементаў складалася гэта велізарнейшая падзея, якая адкрывае новую старонку ў гісторыі перамогі чалавекам прыроды.

Мы шчаслівы цудоўным подзвігам нашых гераічных суграмадзян, выхаваных і навучаных, снаражоных і натхнёных вернай рукой партыі Леніна — Сталіна і яе геніяльным правадыром Іосіфам Вісарыёнавічам Сталіным.

Для нас, будучых настаўнікаў, якія закліканы выхоўваць свядомых грамадзян комуністычнага грамадства, — гэта выдатнейшы прыклад і ўдзячны выхазаўчы матэрыял. Выхоўваць такіх-жа герояў, прывіць дзецям такую-ж бязмежную любоў да сваёй радзімы, да партыі бальшэвікоў і вялікага Сталіна, развіць у іх высокае пачуццё совецкага патрыятызма, якімі валодаюць гераічныя лётчыкі — вось за чаго мы павінны імкнуцца.

Група студэнтаў Менскага педагагічнага інстытута: Кіселевіч, Лаўрэнцеў, Пархімчык, Ліўшыц, Малашка, Макарчук.

ПРАЦОЎНЫЯ ВІТАЮЦЬ АДВАЖНЫХ ГЕРОЯЎ

⊙ **Ва ўсіх кутках БССР** на фабрыках, заводах, у калгасах, установах і навучальных установах з радасцю сустрэлі прапоўныя вестку аб паспяховым завяршэнні пералёту Масква — Паўночны полюс — Паўночная Амерыка. Прапоўныя выказваюць сваё захапленне бяспрыкладным подвігам Герояў Совецкага Саюза тт. Чкалава, Байдукова і Белякова.

⊙ **На сваіх сходах** рабочыя менскай кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка» прынялі наступную прывітальную тэлеграму: «Злучаныя штаты Амерыкі. Портланд. Чкалаву, Байдукову і Белякову. Прывет героям, сталінскім пітомцам, гордым сокалам нашай краіны. Мы, рабочыя, работніцы, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя менскай кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка», разам з усімі прапоўнымі ганарымся вашай перамогай. Мы аддаём усе свае сілы на ўмацаванне абароназдольнасці нашай радзімы».

⊙ **Адзначыць завяршэнне пералёту** новымі вытворчымі перамогамі, у найкарацейшы тэрмін правесці падпіску на пазыку ўмацавання абароназдольнасці нашай вялікай соцыялістычнай радзімы — абавязуюцца прапоўныя Слуцкага раёна.

АМЕРЫКАНСКІ НАРОД ЗАХОПЛЕН ГЕРАЇЗМАМ СОВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ

НЬЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 22 чэрвеня. (БЕЛТА). Сёння адбыўся прыём у гонар Герояў Совецкага Саюза Чкалава, Байдукова і Белякова ў афіцэрскім клубе ў Ванкуверы і сведанне ў Портландскай гандлёвай палаце.

На прыёме ў афіцэрск'м клубе ў Ванкуверы ўвесь камандны склад гарнізона цёпла вітаў экіпаж самалёта «АНТ-25». Мэр Ванкувера прыбыў з афіцыяльным візітам ў дом, дзе спыніліся лётчыкі, каб перадаць ім сваё прывітанне.

***

НЬЮ-ЁРК, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). Велізарныя натоўпы акружаюць аэрадром у Ванкуверы і разглядаюць самалёт «АНТ-25». Самалёт стаіць пасярод аэрадрома ў акружэнні фатографаў, кінооператараў, рэгіструючых кожны рух каманды, якая падрыхтоўвае самалёт для адпраўкі ў Маскву. Учора ўвесь дзень і ноч тысячы аўтамабіляў запрудзілі ўсе дарогі, якія вядуць у Ванкувер. Шмат рабочых і фермераў з бліжэйшых раёнаў, а таксама з вельмі аддалёных месц штата Орэгон і Брытанскай Калумбіі, спякаюцца ў Ванкувер, прывабленыя паведамленнямі па радыё аб пасадцы самалёта. Многія з іх праехалі сотні міль для таго, каб зірнуць на самалёт «АНТ-25».

***

НЬЮ-ЁРК, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). У Ванкувер накіроўваецца безупынны паток прывітальных тэлеграм з усіх частак краіны з віншаваннямі і прывітаннямі совецкім лётчыкам, з выказваннем гарачай дружбы і захаплення. У тэлеграмах падкрэсліваецца, што совецкая навука і тэхніка знаходзяцца на высокім ўзроўні.

***

НЬЮ-ЁРК, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). Пасля сведання ў Портландскай гандлёвай палаце совецкія лётчыкі з гірляндамі кветак на плячах адправіліся па галоўных вуліцах, дзе іх віталі велізарныя натоўпы. Тысячы людзей стоўпіліся на вуліцах і ішлі за совецкімі героямі, стварыўшы грандыёзны імпразізаваны парад.

***

НЬЮ-ЁРК, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). Паўпрэд СССР у ЗША Траяноўскі перад адлётам ў Сан-Францыска (буйны горад на заходнім узбярэжжы ЗША) заявіў, што лётчыкі прабудуць у Сан-Францыска да 24 чэрвеня, пасля чаго накіруюцца ў Вашынгтон (сталіца ЗША), дзе будуць прыняты прэзідэнтам Рузвельтам.

***

НЬЮ-ЁРК, 22 чэрвеня. (БЕЛТА). Чкалаў, Байдукоў і Белякоў прыбылі на камерцыйным аэраплане на Оклэндскі аэрапорт (каля Сан-Францыска). Пяцітысячны натоўп з энтузіязмам вітаў іх. Сустракалі лётчыкаў прадстаўнікі ўрада Сан-Францыска і Оклэнда і прадстаўнікі гандлёвай палаты Сан-Францыска. Оклэндскі аэрапорт ўпрыгожан совецкімі і амерыканскімі сцягамі.

ПАЕЗДКА НЕЙРАТА У ЛОНДАН АДКЛАДЗЕНА

БЕРЛІН (сталіца Германіі), 21 чэрвеня. (БЕЛТА). Афіцыяльна абвешчана, што паездка міністра замежных спраў Нейрата ў Лондан, назначаная на 23 чэрвеня, адкладваецца. Матывуецца гэта тым, што становішча, якое стварылася ў рэзультаце нападу на германскі ваенны карабль» (маецца на ўвазе зыдуманы «інцыдэнт» з караблем «Лейпцыг»), робіць немагчымай адсутнасць міністра замежных спраў ў Берліне. Германскі ўрад паведаміў аб сваім рашэнні брытанскага пасла ў Берліне.

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 21 чэрвеня. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Рэйтэр, адтэрмінаванне паездкі Нейрата ў Лондан зрабіла адмоўнае ўражанне ў Лондане.

ПАСЛЯ ПАДЗЕННЯ БІЛЬБАО

Учора тэлеграф паведаміў усяму свету вестку аб узяцці Більбао — сталіцы Краіны Баскаў — аб'яднанымі сіламі інтэрвентаў і мяцежнікаў.

Пасля доўгіх, упартых крывепралітных баёў, пасля сапраўды гераічнага супраціўлення шалёнаму націску войск інтэрвентаў і мяцежнікаў, галоўныя сілы баскаў пакінулі сталіцу і ў поўным парадку адступілі на захад. У горад уступілі часці італьянцаў і мяцежнікаў. Генерал Франко ў той-жа дзень выдаў дэкрэт аб ліквідацыі аўтаномі Баскскай вобласці.

Дарогай цаной дасталася фашыстам гэта перамога. На працягу амаль трох месяцаў баскі адчайна абаранялі кожную пядзь роднай зямлі, гераічна адбівалі наступленне на сталіцу.

У апошнія дні фашысты сканцэнтравалі на біскайскім фронце велізарную колькасць тэхнічных сродкаў; авіяцыі, артылерыі і танкаў, — і літаральна змяталі з твару зямлі баскскія вёскі і гаралы. На плошчы ў 9—10 кілометраў за адзін дзень, па падліках замежнага друку, інтэрвентамі было выпушчана да 4 тысяч артылерыйскіх снарадаў і скінута каля 2 тысяч авіябомб.

Разам з баскскімі часцямі са сталіцы адышло да 150 тысяч бежанцаў. Фашысцкія варвары з самалётаў бязлітасна знішчалі гэту масу людзей, якія імкнуліся выратаваць сваё жыццё, пазбавіцца ад жахаў фашысцкай акупацыі.

Падзенне Більбао з'яўляецца непасрэдным рэзультатам колькаснай і тэхнічнай перавагі войск інтэрвентаў і мяцежнікаў над часцямі баскаў.

Участак Більбао быў увесь час адрэзан ад іншых франтоў. Баскскае камандаванне магло разлічваць толькі на свае часці і на астурыйскіх гарнякоў. Тым не менш, каб прарваць фронт і заняць Більбао, мяцежнікам трэба было сканцэнтраваць на гэтым участку сотні самалётаў, гармат і танкаў і 25 тысяч італьянскіх салдат.

Падзенне Більбао — гэта частковы поспех мяцежнікаў і інтэрвентаў на другараным участку вайны, поспех, які не выражае зыходу вялікай барацьбы паміж іспанскім народам і фашызмам.

Ініцыятыва, як і раней, у руках рэспубліканцаў і суадносіны сіл усё становяцца больш і больш спрыяльнымі для рэспубліканскай Іспаніі.

Ваенная тэхніка перамагла пад Більбао. Але гэта ваенная тэхніка не можа забяспечыць перамогу фашыстаў на іншых франтах, дзе ўсё больш і больш растуць і мацнеюць сілы рэспубліканцаў, дзе народная армія аснашчаецца ўсё больш багатай і дасканалай ваеннай тэхнікай.

ЗВАРОТ ІСПАНСКАГА УРАДА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 22 чэрвеня. (БЕЛТА). З Валенсіі паведамляюць, што пасля пасяджэння совета міністраў Іспаніі рэспубліканскі ўрад апублікаваў зварот да іспанскага народу па поваду становішча на біскайскім фронце. У звароце гаворыцца:

«Більбао эвакуязан, але краіна баскаў не пераможана. Не можа быць пераможан народ, які ўмее змагацца да апошняй кроплі крыві.

Народ Іспаніі ганарыцца краінай баскаў. Урад рэспублікі больш, чым калі-небудзь поўны рашучасці змагацца да перамогі. Пераменчывасць ваенных поспехаў не падаўляе нас і не змяншае нашы сілы.

Нашы войскі разбілі італьянскія дывізіі пад Гвадалахарай і Пасабланка, а таксама германскія войскі ў раёне ракі Харамы. Нашы войскі атакуюць праціўніка ў Сіера Гвадараме і прасоўваюцца на поўдні. На арагонскім фронце вакол Уэскі спіскаецца кальцо рэспубліканскіх войск. Наша армія даказала сваю магутнасць і сваю непахісную волю перамагчы ворага ў пэнтры, на захадзе, на поўначы і на поўдні краіны.

Ніхто не пазбегне аддавацца песімізму ў сувязі з пераменчывасцю ваенных поспехаў, паколькі даказана, што наш народ аказаўся здольным стварыць магутную армію, засвоіць ваенную тэхніку і стварыць самыя сучасныя, самыя дзейсныя сродкі абароны. Будзем-жа вартымі тых, хто паў пад Більбао, тых, хто змагаўся і прадаўжае змагацца з большым чым калі-небудзь энтузіязмам.

Няхай жыве незалежнасць Іспаніі, няхай жыве свабода нашага народу! Няхай жыве Біскайя, тысячу раз праслаўленая! Наперад да канчатковай перамогі!

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

У зводцы іспанскага міністэрства абароны, апублікаванай 21 чэрвеня ў 14 гадзін 30 мінут, указваецца, што абаронцы Більбао па-ранейшаму аказваюць гераічнае супраціўленне мяцежнікам, уступаючы ў вулічныя баі і адстойваючы кожны дом. У той-жа час рэспубліканская артылерыя ў поўным парадку адступае на пазіцыі на захад ад Більбао, ўказаныя камандаваннем.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

У раёне Універсітэцкага гарадка мяцежнікі некалькі дзён і начэй вялі падкоп пад рэспубліканскія траншэі перад Клінічным шпіталем з мэтай узарвань некалькі мін і затым занялі рэспубліканскія акопы. Работы мяцежнікаў былі заўважаны рэспубліканцамі, залажыўшымі контрміны. Ноччу 20 чэрвеня з дапамогай электрычных апаратаў рэспубліканцы ўзарвалі свае міны і разам з імі міны праціўніка. Узрыў быў чуваць ва ўсім Мадрыдзе. Падземныя ходы фашыстаў былі разбураны. Загінула каля 70 мяцежнікаў. Адна сцяна Клінічнага шпіталя абвалілася, пахаваўшы 30 фашыстаў.

АРАГОНСКІ ФРОНТ

12 рэспубліканскіх самалётаў паспяхова бамбардыравалі розныя будынкі Сарагосы і шчасліва вярнуліся на свае базы. Другая рэспубліканская эскадрылля скінула шмат бомб па дарозе з Уэскі ў Хака. Самалёты мяцежнікаў паявіліся над Лома Верде, але былі прымушаны рэспубліканскімі знішчальнікамі ўцякаць.

Незаслужаны паклёп

У шматтыражцы завода імя Кірава (г. Менск) 10 мая г. г. быў змешчан фельетон пад назвай «Калекі». У ім гаварылася пра адну граматычную памылку, зробленую інжынерам Кажданам пры атрыманні грошай у бухгалтарыі.

Мы, маладыя спецыялісты, зусім згодны, што інжынер павінен быць усебакова культурным чалавекам. Пісаць пісьменна ён абавязан гэтак-жа добра, як ведае тэхніку вытворчасці.

Мы-ж абураны супроць таго тону, якім напісан фельетон. Сам загаловак фельетона — «Калекі» — гаворыць пра тое, што апашлілі ўсіх выпускнікоў Кіеўскага індустрыяльнага інстытута, ніякіх падстаў на гэта не маючы. У фельетоне напісана, што інстытут «парастыкаў» студэнтаў на вытворчасці. Няўжо для рэдакцыі «Кіравец» і аўтара фельетона невядома такая ісціна, што студэнты, скончыўшыя навучальную ўстанову, накіроўваюцца ўрадам у планавым парадку на пэўную работу! Нязгодны мы таксама з тым, што ў фельетоне абвінавачваецца ўвесь інстытут у варожасці.

Нам здаецца, што гэты фельетон не мае нічога агульнага з рэальнасцю. Ён накіраван на падрыў аўтарытэту маладых спецыялістаў, якія прыехалі з Кіеўскага індустрыяльнага інстытута.

ПЕРЛІНА, КАЖДАН, КЕЦЛАХ, ЗАЛМАНСОН і інш.

Антырэлігійная работа не праводзіцца

У мястэчку Янавічы, Суражскага раёна, ёсць спіртзавод, ільназавод, малочны завод, млын, шавецкая і кравецкая арцелі. На гэтых прадпрыемствах занята даволі вялікая колькасць рабочых. Адсюль — раённыя арганізацыі павінны былі аддаць асаблівую ўвагу правядзенню палітычнай, выхаваўчай і антырэлігійнай работы. Аднак гэта адсутнічае ў Янавічах.

Работа ў клубах не правозіцца. Сюды часамі заязджаюць раённыя работнікі, але не было такога выпадку, каб хто-небудзь з іх зрабіў даклад на якую-небудзь тэму міжнароднага ці ўнутранога становішча. А між тым, працоўных мястэчка хвалюе рад пытанняў, — як грамадзянская вайна ў Іспаніі, заваяванне совецкімі лётчыкамі Паўночнага полюса, а таксама антырэлігійныя пытанні. Такія даклады з задавальненнем выслухалі-б працоўныя.

Адсутнасць усякай агітацыйнай і антырэлігійнай работы сярод насельніцтва мястэчка развязала рукі сектантам і царкоўнікам для таго, каб ахутаць рэлігійным дурманам адсталую частку насельніцтва мястэчка.

Райкому партыі і райвыканкому патрэбна нарэшце зрабіць адпаведныя вывады з усяго таго, што робяць царкоўнікі ў Янавічах. Неабходна разгарнуць палітычную і антырэлігійную работу ў мястэчку.

З—ні.

Не клапоцяцца аб бытавых умовах тарфянікаў

Торфарцель імя 16 партызан (Смілавіцкі раён) з месяца ў месяц не выконвае план торфаздабычы. Прычыне загадзя не падрыхтавалася да торфсезона. Замест патрэбных 520 рабочых завербавана ўсяго 170. Працуе-ж значна менш. Многія рабочыя, пабыўшы пару дзён, пакідаюць працу. Тлумачыцца гэта дрэннымі бытавымі ўмовамі. Каб паспелаць у сталоўны, рабочы павінен устаць а 5 гадзіне раніцы і да 9 гадзін прастаяць у чарзе. Выплата заработку праводзіцца нерэгулярна.

СТАХАНАВЕЦ.

У Архангельскі порт прыбыў іспанскі пароход «Манучу», зафрахтаваны «Северолесом» для перавозкі піламатэрыялаў у Англію. НА ЗДЫМКУ: каманда іспанскіх мараноў на лесабіржы імя Молатава ў Архангельскім парту. Фото Курылава (СФ).

ТЭАТР „СЛАВА"

У ПАСТАНОЎЦЫ МАСКОЎСКАГА ТЭАТРА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Маскоўскі Цэнтральны тэатр Чырвонай Арміі хутка закончыць свае гастролі ў Менску. Працоўныя сталіцы ветліва сустрэлі прадстаўнікоў тэатральнага мастацтва брацкага рускага народу. Лепшыя пастаноўкі тэатра п'ес М. Горкага «Мяшчане» і «Васа Жалезнова», «Гок дзевятнаццаты» Прута і «Слава» В. Гусева і інш. менскі гледач праглядзеў з выключнай увагай і задаволенасцю. У другі раз працоўныя сталіцы ўбачылі гэты здаровы творчы тэатральны арганізм, які, працуючы па ўдасканаленню сваёй сцэнічнай культуры, можа давесці да гледача вобразы жывых, простых і адданых людзей.

У гэтым плане мы хочам спыніцца на пастаноўцы п'есы ў вершах В. Гусева «Слава», не адмаўляючы таго, што горкаўскія пастаноўкі ёсць самае каштоўнае ў рэпертуары сёлетніх гастролей маскоўскага Тэатра Чырвонай Арміі.

«Слава» — надзвычай багатая п'еса па паказу нашай рэальнай сапраўднасці, гераізма і адданасці, якімі жывуць народы Совецкага Саюза. Як аўтар п'есы, так і рэжысёры пастаноўкі тт. А. П. Глекаў і В. П. Пільдон, пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтва А. Д. Папова, унёслі схемы ў паказе жывых людзей, адышлі ад паказу славы ў асабістым, як быццам часта абываецельскім, разуменні гэтага тэрміна і паказалі нашу славу, якая дабываецца мужнасцю і адданасцю ў барацьбе за справу партыі, паказалі славу, якую прыносіць сваім сынам наш народ. Вобраз ваеннага інжынера, лётчыка Васілія Матылькова, які выратоўвае дзесяткі, сотні людзей ад разбушаванай стыхіі прыроды (горны абвал) і заваёўвае гэтым славу, вельмі характэрны, а таму і праўдзівы.

Заслужаны артыст рэспублікі Б. В. Бельскі, выконваючы ролю Матылькова, у значнай меры выклікае непадкупную пепльню да апошняга і стварае прыемнае адчуванне ў гледачоў, якія сочаць за паводзінамі радавога лётчыка нашага часу. Аднак трэба падкрэсліць, што там, дзе артыст Бельскі імкнецца да камізму, прычым часта залішняга, там вобраз Матылькова некалькі траціць сваю сілу, як мужнага і валявога чалавека, некалькі траціць сілу ўздзеяння на гледача.

Пастаноўка падкупляе гледача прастатой самога сюжэта п'есы, рэальнасцю паказаных у ёй падзей і асабліва—ігрой акцёраў. Выключна каштоўным з'яўляецца тое, што на працягу ўсяго спектакля гледач алпачывае, хвалюецца і весела смяецца. Наяўнасць у п'есе трапных выражэнняў, шчырых і тыповых пагаворак, якія ідуць з народнай творчасці, — усё гэта падтрымлівае ў гледача на працягу ўсяго спектакля прыпадняты настрой, узбуджае яго аптымістычныя і патрыятычныя пачуцці.

Трэба асобна вылучыць ігру заслужаных артыстаў рэспублікі А. Е. Хахлова (праф. Чарных) і Н. Л. Канавалава (Мядзведзеў), у якіх адчуваецца сцэнічнае майстэрства, багацце культуры рускай мовы.

Падкрэсліваючы, што пастаноўкай «Славы» тэатр стварае праўдзівы спектакль выключнай прастаты, трэба асобна спыніцца на вобразе мацеры Матылькова — Марыі Пятроўны. Самае каштоўнае ў ім — гэта паказ хвалюючых пачуццяў за сваю радзіму, свой народ, для чаго маці не шкадуе ўсіх сваіх чатырох сыноў — гордых патрыётаў у галіне авіяцыі, навукі, гаспадаркі. Артыстка Ф. Г. Ранеўская іграе, бадай, лепш за ўсіх у гэтай пастаноўцы. Яна, ведаючы меру хвалявання і смутку, радасці і весялосці, даносіць да гледача вобраз сапраўды рабочай мацеры, якая для сыноў «сама бялізну памые і, калі трэба, у паходную сумку яе паклазе». Кожнае слова мацеры даходзіць да гледача, бо яно шчырае, цёплае.

Змястоўная п'еса, ігра ўсяго творчага калектыва, які ўдзельнічае ў пастаноўцы, пяярэнае музычнае і мастацкае афармленне, даюць гледачу моцную эмацыянальную зарадку, культурны адпачынак. Спектакль пакідае добрае ўражанне ў гледача і заслугоўвае ўдзячнасць творчаму калектыву тэатра.

ПАВ. КАВАЛЁЎ.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Сход райпартактыва Кагановіцкага раёна па пытанню аб выніках XVI з'езда КП(б)Б адбудзецца 25 чэрвеня ў 6 гадзін вечара ў памяшканні клуба імя Сталіна (рог Інтэрнацыянальнай і Комсамольскай).

***

Чарговыя заняткі гуртка па гісторыі ВКП(б) адбудуцца 23 чэрвеня ў 7 гадзін вечара ў Доме партактыва.

АД ЛЕПЕЛЬСКАГА РК КП(б)Б

Украдзены партыйны білет № 0875449, выданы Лепельскім РК КП(б)Б на імя Манастырскага Залмана Майсеева, лічыць несапраўдным.

Сакратар Лепельскага РК КП(б)Б. КАВАЛЁЎ.

АД ЗАСЛАЎСКАГА РК КП(б)Б

Згублены партыйны білет № 0864718, выданы Заслаўскім РК КП(б)Б на імя Чуйко Афанасія Сямёнавіча, лічыць несапраўдным.

Сакратар Заслаўскага РК КП(б)Б ХАСКІН.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 23 ЧЭРВЕНЯ

8.30—«Апошнія паведамленні». 10.00 — сканчэнне справаздачнага даклада сакратара ЦК КП(б)Б т. Шаранговіча на XVI з'ездзе ПК КП(б)Б на польскай мове. 16.05 — канцэрт. 17.00 — перадача для дзяцей. 18.30—заочная партыйная школа. 20.00—газетныя артыкулы. 20.15—палітінфармацыя на польскай мове. 20.30 — мантаж оперы. 21.45 — лёгкая музыка. 24.00 — перадача на замежных мовах.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Беларускага драмтэатра — ГАСТРОЛІ МАСКОЎСК ТЭАТРА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ МЯШЧАНЕ

Памяшканне Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатра — Гастролі Украінскага дзяржаўнага драматычнага тэатра гор Сталіно ПЕСНЯ АБ СВЕЧЫ

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка» ДНЯПРО Ў АГНІ

Дзіцячы гукавы кінатэатр ЮНАЦТВА МАКСІМА Ад 24 чэрвеня—ЗВАРОТ МАКСІМА

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» АРСЕН

Гукавы кінатэатр «Спартак» ВЯЛІКАЕ ГОРА МАЛЕНЬКАЯ ЖАНЧЫНЫ

Гукавы кінатэатр „Інтэрнацыянал"

Ад 23 чэрвеня на экране каляровы гукавы мастацкі фільм

САЛАВЕЙ САЛОВУШКА

(Груня Карнакова)

Рэжысер Н. ЭКК.

У галоўных ролях: Н. ЭКК, ІВАШЭВА, ЕГОРАВА, АТАЎ і інш.

КАЛГАСЫ, КАЛГАСНІКІ І СЯЛЯЧЕ-АДНААСОБНІКІ!

ЛАЗОВУЮ І ЯЛОВУЮ КАРУ

НЕАБХОДНУЮ

для скуранай і дубільна-экстрактавай прамысловасці нашага Саюза

ЛАЗОВАЯ І ЯЛОВАЯ КАРА прымаецца ў неабмежаванай колькасці крамамі і складамі спажыўкааперацыі па ўстаноўленых цэнах:

У ГЛЫБІННЫХ ПУНКТАХ:

Лаза 15 кап. кгр. або 150 руб. тона

Яліна 8 кап. кгр. або 80 руб. тона.

Апрача таго аплачваецца кошт вывазкі на заготпункты.

Здзірку лазовай кары рабіце толькі з ссечанага куста, убіраючы куст па ўказанню лясніка, гэта захоўвае лазовыя зараснікі і не засмечвае лесу.

ЯЛОВУЮ КАРУ збірайце з ссечанай яловай драўніны на лесаўчастках, на калгасным, школьным і іншым будаўніцтве.

Беларуская рэспубліканская кантора па снабжэнню і збыту скурпрамысловасці «БЕЛСКУРСНАБЗБЫТ».

НОВАБЕЛІЦКІ РАБФАК ПРЫ БЕЛАРУСКІМ ЛЕСАТЭХНІЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ ІМЯ КІРАВА

абвяшчае АСЕННІ НАБОР СТУДЭНТАЎ на ўсе курсы

(1-ы, 2-гі і 3-ці) дзённага аддзялення і на першы і чацверты вячэрняга аддзялення.

Умовы прыёму агульныя для рабфакаў. Усе новапаступаючыя павінны трымаць іспыты. Асобы, якія маюць пасведчанні аб сканчэнні НСШ, пры паступленні на першы курс дзённага і вячэрняга аддзялення трымаюць іспыты ў аб'ёме праграмы НСШ па рускай і беларускай мовах і матэматыцы (вусна і пісьмова), геаграфіі і грамадазнаўству (вусна), а таксама павінны быць знаёмы з новай Канстытуцыяй СССР і БССР. Асобы, якія паступаюць на старшыя курсы, трымаюць іспыты па ўсіх прадметах адпаведнага курса ў аб'ёме праграмы: на 2-гі дзённы курс — 8 класаў СШ, а на трэці дзённы і чацвёрты вячэрні курсы — 9 класаў СШ.

Заявы з дакументамі (абавязкова ў арыгіналах): аўтабіяграфія, метрыка, пасведчанне аб адукацыі, даведка аб стане здароўя, 2 фотакарткі з уласнаручным подпісам паступаючага на іх, паштовых марак на 40 кап. і пашпарт (мець пры сабе) накіроўваць па адрасу: г. Новабеліца, Гомельскага раёна, вуліца Вароўскага, 10, канцылярыя лесатэхнічнага рабфака.

Прыём заяў — з 1 чэрвеня па 1 жніўня.

Іспыты будуць праведзены з 20 па 27 жніўня. Яўка на іспыты толькі па выкліку рабфака.

Усе студэнты дзённага аддзялення і 4-га курса вячэрняга аддзялення рабфака забяспечваюцца стыпендыяй (па паспяховасці), а іншагародняя таксама і інтэрнатам.

ДЫРЭКЦЫЯ.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНЫ ТЭХНІКУМ сістэмы НКЗБ (у г. Горках, БССР)

абвяшчае АСЕННІ НАБОР СТУДЭНТАЎ

на 1937/38 навучальны год — першы курс.

Тэхнікум рыхтуе землеўпарадчыкаў-тапографаў.

У тэхнікум прымаюцца асобы не маладзей 16 год і не старэй 30.

Для ўсіх паступаючых абавязковы прыёмовыя іспыты (па праграме 7-гадовай школы) па матэматыцы, фізіцы, фізічнай геаграфіі, палітграмаце, беларускай і рускай мовах і літаратуры.

Заявы з дакументамі прымаюцца да 15 жніўня 1937 г., а з 15 па 25 жніўня праводзяцца іспыты.

Да заяў прыкладаюцца дакументы ў арыгіналах: кароткая аўтабіяграфія паступаючага, пасведчанне аб сканчэнні няпоўнай сярэдняй школы, даведка ад дзяржаўнай лячэбнай установы аб здароўі, даведка аб годнае паводзіны, дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, засведчаныя дзяржаўнай установай і марак на 40 кап.

Прыязджаючыя на іспыты павінны мець пры сабе пашпарт.

Студэнты тэхнікума забяспечваюцца інтэрнатам, сталовай і стыпендыяй па паспяховасці ад 60 да 70 руб. у месяц.

Тэрмін навучання ў тэхнікуме 4 гады.

Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: г. Горкі, БССР, землеўпарадкавальны тэхнікум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІКУМ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ у г. Менску

абвяшчае АСЕННІ НАБОР

на 1937—38 навучальны год.

Тэрмін навучання 3 гады. Пачатак навучальнага года 1 лістапада.

Беларускі дзяржаўны тэхнікум фізічнай культуры з'яўляецца адзінай сярэдняй навучальнай установай, якая рыхтуе работнікаў па фізкультуры для Беларусі.

Тэхнікум рыхтуе:

а) выкладчыкаў фізкультуры для сярэдніх і няпоўных сярэдніх школ, ФЗВ, рабфакаў і тэхнікумаў.

б) інструктароў фізічнай культуры для вытворчых саўгасных МТС, калгасных калектываў фізкультуры, а таксама для арганізацый «Дынамо», «Спартак» і прафсаюзных калектываў фізкультуры.

в) Інспектароў-метадыстаў для райсоветаў фізкультуры і інструктароў раённых арганізацый.

г) Спецыялістаў-выкладчыкаў спартыўных школ па асобных відах спорту.

У тэхнікум фізкультуры прымаюцца совецкія грамадзяне абодвух полаў ва ўзросце ад 17 да 30 гадоў, якія маюць адукацыю ў размеры няпоўнай сярэдняй школы ці аднэй класаў сярэдняй школы.

Паступаючыя ў тэхнікум фізкультуры падаюць заяву (асобіста ці па пошце) аб прыёме на імя дырэктара тэхнікума з прыкладаннем наступных дакументаў: а) атэстата аб адукацыі, б) метрыкі, в) пасведчання дзяржаўнай лячэбнай установы аб тым, што паступаючы не мае хваробы, якія перашкаджалі паступленню ў тэхнікум фізкультуры, г) 2 фотакарткі з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, заборкі з дзяржустановай, д) даведкі аб здачы норм ГТО і ступені і аб ім ваенасці, значка.

Прыём заяў у тэхнікум фізкультуры праводзіцца з 15 чэрвеня па 15 верасня.

Прыёмныя іспыты і заняткі з 10—26 кастрычніка 1937 г.

Іспыты праводзяцца па наступных прадметах: рускай і беларускай мовах (вусна і пісьмова), матэматыцы (вусна і пісьмова), фізіцы (вусна і пісьмова). Канстытуцыі і спартыўных нарматывах: па гімнастыцы на гімнасце, рыўку і выпрыгку і па лёгкай атлетыцы на хуткасць, скач і прыгнутасць.

Усе заняткі на 1 курсе забяспечваюцца стыпендыяй у размерах ад 90 да 140 руб. у мес. Іншагародняя забяспечваюцца інтэрнатам. Прыезд на іспыты па выкліку па прыездзе неабходна прадаўляць пашпарт.

Запросы і заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: Менск, Валадарскага, 5, Беларускі дзяржаўны тэхнікум фізкультуры, прыёмная камісія, тэл. 24-794.

23 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні клуба імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай) адбудзецца пасяджэнне

ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

Парадак дня:

АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

УВАГА: ПАСЕДЖАННЕ ПАРТГРУПЫ ПЛЕНУМА адбудзецца ў гэтым-жа памяшканні ў 6 г. 30 м. вечара.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

абвяшчае ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ

НА 1937-38 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД НА 1 КУРС НАСТУПНЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ:

ГІСТАРЫЧНЫ — рыхтуе гісторыкаў: а) дрэўняй гісторыі, б) гісторыі сярэдніх вякоў, в) новай гісторыі, г) гісторыі народаў СССР і д) гісторыі БССР.

ФІЗІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ — рыхтуе: а) фізікаў б) матэматыкаў.

БІЯЛАГІЧНЫ — рыхтуе: а) заолагаў, б) батанікаў.

ХІМІЧНЫ — рыхтуе а) хімікаў-арганікаў, б) хімікаў-неарганікаў, в) фізіка-хімікаў.

ГЕАГРАФІЧНЫ—а) геаграфіі.

ЯЎРЭЙСКАЯ СЕКЦЫЯ пры фізіка-матэматычным факультэце (фізікаў, матэматыкаў).

Універсітэт рыхтуе высокакваліфікаваныя кадры работнікаў навукова-даследчых установаў, асістэнтаў вышэйшых навучальных устаноў і выкладчыкаў поўных сярэдніх школ.

Паступаючыя ў БДУ павінны мець закончаную сярэднюю асвету і трымаюць іспыты па рускай і беларускай мовах, матэматыцы, фізіцы, хіміі замежнай мове і палітграмаце. Паступаючыя на геафак трымаюць іспыты па геаграфіі. Паступаючыя на гістфак — па геаграфіі і гісторыі.

Прыём заяў з 20-га чэрвеня па 1 жніўня 1937 года.

Прыёмныя іспыты з 1 па 20 жніўня г. г.

Пачатак заняткаў з 1 верасня. Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй на агульных падставах.

Іншагародняя забяспечваюцца інтэрнатам. Праграмы іспытаў высылаюцца па атрыманні паштовых марак на 60 кап.

Увага: У раней надрукаванай аб'яве («Звязда» ад 20 мая, № 114) не было ўказана, што паступаючыя на геаграфічны факультэт трымаюць іспыты па геаграфіі, а паступаючыя на гістарычны факультэт—па геаграфіі і гісторыі.

Адрас: Менск, Універсітэцкі гарадок, прыродазнаўчы корпус, пакой № 105.

РЭКТАРАТ БДУ.

Саўгас імя Лекерта Белканторы «Заготжывёла», Прыгараднага с/с.

ЛІКВІДУЕЦЦА.

Усе установы, арганізацыі і асобы, якія маюць прэтэнзіі да ўказанага саўгаса, павінны падаць заявы да 1 ліпеня 1937 г. Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ.

Прадаецца ДОМ з 3-х кватэр на Кобданаўскім тракце, 47.

Даведацца: вул. Дзяржынскага, 21, кв. 5.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

Уп. Галоўлітбела № К—2135. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К. К. С.